Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навукарыстаныя рукапісы назад зўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. „ 3 „ . . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: 1 экзэмпляр — 20 к. месяцовых . . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок пашпарэлі насьпрэд тэксту 1 р. — к. За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. дарожэй. Знак тэрмэйу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумэнт . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 124 (2312) Чацьвер, 31-га мая 1928 г.

Трэба быць на варце.

Шахцінская справа, нядаўні крывіс хлебазагатовак, гісторыі ў Смаленску і Сочы—усё гэта паказальнікі нашых слабых месц, усё гэта сыгналізуе аб небясьпеках, якія могуць нас разлавіць, калі супроць іх ня ўжыць сур'ёзных і адпаведных вострых мер.

І шахцінская справа, і смаленская, і хлебазагатоўкі для шмат каго з нас былі няпрыемнымі «неспадзянкамі».

Шэсьць гадоў данбасаўскія шкоднікі руйнавалі нашу вугольную прамысловасьць, пакуль гэта «раптам» ня было выкрыта.

Перадапошнія хлебазагатоўкі прайшлі вельмі добра, а апошнія «неспадзявана» амаль не сарваліся. У Смаленску «раптам» выяўлена, што шэраг працаўнікоў вялі варожую партыі палітыку.

Усе гэтыя нашы «неспадзянкі», дзякуючы энэргіі партыі і рабочай клясы, у большасьці зьліквідаваны. Шахцінцы сядзяць на лаўцы падсудных, тэмп хлебазагатовак значна ўзмацніўся. Смаленскія і сочынскія арганізацыі на шляху да поўнага выдараўленьня. Але гэта ня значыць, што гэткія «неспадзянкі» ў далейшым ня могуць ужо здарыцца і што на ліквідацыі іх можна супакоіцца. Наадварот, мы павінны яшчэ больш узмацніць сваю дбайнасьць і пільнасьць, яшчэ больш крытычна адносіцца да сваіх дасягненьняў.

Каб змагацца з небясьпекамі—трэба іх умець прадбачыць. Мы ідзем на цяжкаму шляху. І калі мы хочам дайсьці да канчатковай мэты, мы павінны ўмець бачыць ужо здалёку кожную яму, каб ня ўпасьці і не разьбіцца, а абмінуць гэтую яму, пакласьці праз яе моцныя масткі, або зусім засыпаць яе.

Прадбачыць небясьпекі — нялёгка, асабліва на такім гіганцкім шляху, як шлях да сацыялізму. Зразумела, чым маюць больш вопыт нашы правадыры, чым лепш кіруюць яны, тым больш шансаў за тое, што памылак і балячак будзе менш.

Але і дзесяткі і сотні добрых кіраўнікоў ніколі ня змогуць бачыць усе недахваты, усе памылкі, усе скажэньні. Толькі тады, калі разам з імі, побач з імі будуць пільна сачыць за ўсімі недахватамі тысячы і міліёны рабочых; калі ўся рабочая кляса будзе выкрываць памылкі будаўніцтва і будзе разам з намі паляпшаць працу—толькі тады мы будзем гарантаваны ад „нечаканых" правалаў на нашым шляху.

Мы павінны дамагчыся, каб кожны рабочы, як добры гаспадар, прышоў-бы і сказаў нам: «тут ня добра—перарабі, тут правер, тут папраў, тут зрабі так».

Мы павінны дамагчыся, **каб уся рабочая кляса вельмі ўважліва глядзела**, каб кожны пралетары сваім словам—сыгналам мог папярэдзіць нас аб магчымых небясьпеках, аб скрытых ворагах, аб няпрыметных часамі для кіраўнікоў маленькіх балячках, якія могуць заразіць увесь арганізм. Мы павінны дамагчыся поўнага правядзеньня ў жыцьцё лёзунгу самакрытыкі.

Мы павінны дамагчыся таго, каб зьнізу з гушчы міліённых масаў ішла здаровая крытыка нашых недахватаў, ішло прадбачаньне небясьпек і спосабы змаганьня з імі.

Толькі пры гэтых умовах мы будзем гарантаваны ад усялякіх шахцінскіх, смаленскіх і іншых «неспадзянак».

КААЛІЦЫЯ НЯМЕЦКІХ МЕНШАВІКОЎ І БУРЖУАЗЕІ

БЭРЛІН, 29-5. Папярэдняя стадыя неафіцыйных перамоў між нямецкімі буржуазнымі партыямі аб заснаваньні ўраду скончилася. Афіцыйных перамоўх хутка распачнуцца. Цэнтральным камітэту партыі выпрацоўваюць афіцыйныя партыйныя плятформы для надыходзячых перамоў.

Пасяджэньне цэнтральнага камітэту сац.-дэмакратычнае партыі склікаецца ў Бэрліне на 6 чэрвеня. На пасяджэньні будзе вырашана пытаньне аб удзеле сацыял-дэмакратаў за ўрадзе вялікае кааліцыі.

Из 6-7 месцаў склікаецца у Бэрліне пасяджэньне цэнтральнага камітэту партыі центру.

Найбольш магчымымі кандыдатамі ў рэйхсканцлеры лічацца Герман Мюлер (сацыял-дэмакрат), Браун (сац.-дэмакрат) і Зэвэрынг (сац.-дэмакрат). Лічыцца таксама надзвычайна магчымай кандыдатура Гільфэрдынга на пасаду міністра фінансаў.

Нямецкія меншавікі супрацоўнічаюць з фашыстамі.

БЭРЛІН, 28-5. Аб супрацоўніцтве сацыял-дэмакратаў і арганізацыі саюзу „рэспубліканскі сьцяг" з нацыяналістамі і „сталёвым шлемам" паведамлялася ня раз. Дзіўны прыклад гэтага роду падае «Морген Пост». «Мясцовыя групы» «рэспубліканскага сьцягу", «сталёвага шлёму» і юнацка-нямецкі ордэн у Гольсінгене пастанавілі пабудаваць „дом Эбэрта-Гіндэнбурга".

ГРОЗНАЕ НАПАМІНАНЬНЕ БУРЖУАЗЕІ.

БЭРЛІН. Другі дзень збору чырвонага саюзу франтавікоў у Бэрліне 28 мая быў прысьвечан наведваньню магіл ахвяр рэвалюцыі ў ваколіцах Бэрліну, а таксама маніфэстацыям ва ўсіх раёнах гораду. У часе гэтых маніфэстацый рабочыя Бэрліну горача разьвітваліся з удзельнікамі збору. Выезд удзельнікаў збору адбыўся ў поўным парадку ў 32-х спэцыяльных паязідах і на шмат грузавіках.

Збор зрабіў вялікае ўражаньне нават на буржуазныя гушчы жыхарства. Аб гэтым пісалі як у буржуазных газэтах, так і ў сацыял-дэмакратычнай «Форвэрц».

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

У ПОЛЬСКІМ СОЙМЕ.

чэрвеня г. г. у польскім сойме між іншым будзе разглядацца прапазіцыя паслоў Беларускага клюбу «Змаганьня за правы сялян і работнікаў» па справе забойства паліцыянтам Роўбэ двух беларускіх сялян.

ШТО ДАЛЕЙ?

М. Недзялкоўскі ў пэрэсаўскім „Роботніку" (№ 147) піша: «Сучасная сыстэма кіраваньня Польшчай нерэрыўна зьвязана з асобай марш. Пілсудзкага. Ні для каго не таямніца, што ні п. Бартэль, ні п. Славэк, ні хто іншы не маглі-б ні пры якіх варунках аб'яднаць у сваіх руках такой самой паўнаты ўлады.

Таму жаданьне ўмацаваньня гэтай сыстэмы ў ідарваньні ад адзінкі, якая яе стварыла,—стварыла-б заданьне, якое зусім ня можна-б было выканаць».

УРАЧЫСЬТАСЬЦІ „СТШЭЛЬЦА" Ў ЛЬВОВЕ.

З 26 мая г. г. у Львове пачаўся вбор так званых „стшэльцаў", г. ё. стралкоў—арганізацыі, якая—побач войска—мае сваю мэтаю вайсковую падрыхтоўку моладзі. Па вуліцах Львова прайшлі ўжо лічныя грамады стралкоў, якія ў ліку 6 тыс. адправяцца ў 45-кілёмэтравы паход.

ПАЗЫЧКА ДЛЯ ЛОДЗІ.

«Курэр Варш.» (№ 146) паведамляе, што амэрыканская банкірская фірма «Лішпорт і Гольгэртэн» згадзілася даць Лодзі пазычку, разьмерам у 6 млн. даляраў, на 30 гадоў, па 7 проц.

ПОЛЬСКІ ЛЁТ У АМЭРЫКУ.

Польскія лётчыкі майёры Ідзікоўскі і Кубала, якія зьбіраюцца гэтымі днямі вылятець з Эўропы ў Амэрыку (Нью-Ёрк), зрабілі ўжо пробны лёт, які трываў 30 гадзін, пасьля чаго яны апусьціліся з прычыны сапсаваньня прыводу.

Лётчыкі пераканаты, што іх апарат гадзіны для пералёту праз акіян.

ГУРАГАН У СТАЎПЕЦКІМ ПАВЕЦЕ.

Польскія газэты паведамляюць, што 26 мая г. г. у Стаўпецкім павеце прайшоўся сільны гураган, які зьнішчыў больш 120 буд[illegible], фруктовыя сады і засевы, а ў Ласох[illegible] [illegible] дрэў.

НАПАД НА ПАСЛА СОЙМУ БРОДА.

«Наш Пшэгляд» (№ 145) паведамляе, што 4 хуліганы напалі 25 мая г. г. ў Тамашове Мазавецкім на пасла сойму рабіна Брода, які ішоў разам з сваім знаёмым. Дзякуючы энэргічнаму адпору пасла Брод не пацярпеў, а яго знаёмы быў моцна пабіты хуліганамі.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ПОЛЬШЧЫ.

Паводле статыстычных даных, за час ад 12 да 19 мая г. г. у Польшчы было 140996 беспрацоўных, у тым ліку 32870 беспрацоўных кабет.

БЕСПРАЦОЎЕ Ў ЛОДЗІ.

У Лодзі ў 5 паветах было зарэгістравана ў дзень 26 мая г. г. 24335 беспрацоўных. У самой Лодзі—16812. Дапамогай карысталася 12862 асоб, а ў самой Лодзі—10181 асоба.

ЛЁТНЫЯ КАТАСТРОФЫ.

Страшная лётная катастрофа здарылася каля Дэмбліна. Самалёт, які ў часе вялікага дажджу спускаўся ўжо на зямлю, зачапіўся коламі за верхавіну дрэва і ўпаў на зямлю. Самалёт разьбіўся ўшчэнт, а капітан Дамброўскі і сэржант Мяшкоўскі забіты на сьмерць. Другая катастрофа здарылася з самалётам «Потэз 28», які накіроўваўся з Пазнані ў Торн. Ён упаў у паветраны гураган і разьбіўся ўшчэнт. Пагучы. Я. Шулейка і сэржант З. Кліке забіты.

БЕЛАЭМІГРАНТЫ ЎЖО НА ВОЛІ.

Усе расейскія белаэмігранты, арыштаваныя ў сувязі з замахам Ю Войкаховскага на вашага гандлёвага прадстаўніка т. Лізарава, вызвалены ўжо з астрогу. Застаў ся яшчэ пад арыштам толькі адзін абвінавачаны Валеры Макшэяў.

ЗЬЕЗД ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЕ ШКОЛЫ.

Галоўная Ўправа Таварыства Бел. Школы зрабіла захады перад Баранавіцкім старостай дазволіць зьезд сяброў Т-ва Баранавіцкага павету. Парадак дню: 1) даклад прадстаўніка галоўнае ўправы аб працы Т-ва Бел. Школы; 2) выбары баранавіцкае акр. управы; 3) арганізацыя бібліятэк-чытальняў і народных дамоў; 4) бягучыя справы.

АНТЫЯПОНСКІ УЗДЫМ НА ПОЎДНІ КІТАЮ.

Нанкінскі ўрад папераджае Японію не абвастраць становішча.

Поўны байкот японцам.

ШАНХАЙ, 29-У. Падзеі ў Цзынані і мэмарандум Японіі выклікалі ва ўсім поўдні Кітаю нябывалую хвалю абурэньня проці Японіі. У некаторых гарадох і ў шмат якіх вёсках адбываліся вялікія дэманстрацыі, працэсіі і мітынгі. У Ханькоу выходзіць спэцыяльная антыяпонская часопісь. У Канконзе брытанская ўлада забараніла антыяпонскія дэманстрацыі.

Упаўнаважаны нанкінскага ўраду па замежных справах у Шанхаі агаласіў зварот да японскіх грамадзян, прапануючы ім ня выходзіць за мяжу гораду.

У некаторых партох пароходы разгружаюцца японскімі салдатамі, бо кітайскія грузчыкі адмовіліся працаваць. У Кантоне жыхарства адмаўляецца ад японскае мэдыцынскае дапамогі. У Шанхаі пошта не дастаўляе лістоў японцам. Укладчыкі японскіх банкаў бяруць назад свае грошы. У адным Шанхаі ў працягу дзесяці дзён з японскіх банкаў забрана назад дзесяць міліёнаў даляраў. У Кантоне тэкстыльныя фабрыкі спыніла ўжываньне японскае прадзіва. У Шанхаі большасьць фабрыкантаў спыняюць закупку японскага вугалю.

Адказ Нанкіна на японскі мэмарандум.

ШАНХАЙ, 29-У. Агалошан мэмарандум нанкінскага ўраду, пададзены японскаму генэральнаму консулу ў Шанхаі ў адказ на мэмарандум Японіі аб ваенных апэрацыях у паўночным Кітаі.

Мэмарандум нанкінскага ўраду адзначае, што ваенныя апэрацыі проці пекінскага ўраду „ўвайшлі ў апошнюю стадыю. Нацыянальны ўрад бярэ на сабе поўнасьцю адказнасьць за захаваньне парадку ў Манчжуры. Меры, якія можа ўжыць японскі ўрад у Манчжуры, ня толькі зьвязяцца ўмешваньнем ва ўнутраныя справы Кітаю, але і будуць грубым парушэньнем прынцыпу ўзаемнае пашаны да тэрытарыяльнага суверэнітэту абедзьвюх дзяржаў, Нацыянальны ўрад ніколі на зможа прызнаць такія мерапрыёмствы».

У канцы мэмарандуму выказваецца надзея, што японскі ўрад, дзеля захаваньня японска-кітайскае прыязьні, ухіліцца ўжываць меры, якія пашкодзяць разьвіцьцю гэтых прыяцельскіх адносін.

Нанкін—пастаянная сталіца Кітаю.

ШАНХАЙ, 29-5. Водлуг паведамленьняў друку, нанкінскі ўрад пастанавіў, у выпадку ўваходу ў Пекін, пакінуць Нанкін сталіцаю Кітаю.

ШАНХАЙ, 29-5. Нанкінскі ўрад атрымаў ад розных кітайскіх арганізацый заграніцаю звыш паўмільёну даляраў у фонд барацьбы з японцамі.

„Літве рэальна пагражае польская небясьпека".

Заява Вальдэмараса прадстаўніку ТАСС.

КОЎНЯ, 29-У. Вальдэмарас, які вярнуўся з Лёндану, меў гутарку з прадстаўнікамі мясцовага і чужаземнага друку адносна свайго падарожжа.

Карэспандэнт ТАСС запытаў Вальдэмараса аб наступным: «Як перадавалі газэты аб гутарцы з карэспандэнтам „Дэйлі Тэлеграф", вы казалі, што магчымасьць саюзу між Літвою і Польшчаю залежыць ад Польшчы; у чым канкрэтныя ўмовы, пры якіх магчыма было-б ажыцьцяўленьне гэткага саюзу, і ці можна з вашае заявы зрабіць вывад, што саюз быў-бы магчымым у выпадку, калі-б Польшча пашла на некаторыя ўступкі Літве?"

Вальдэмарас у адказ заявіў: «Карэспандэнт перадаў не дакладны зьмест гутаркі, а толькі свой агульны вывад. Я зазначыў на непармальнасьць нашых адносін з Польшчаю і пры гэтым заявіў, што лічу магчымым перагляд гэтых адносін. Я зазначыў далей, што з моманту свайго заснаваньня ў якасьці самастойнае дзяржавы Польшча зрабілася цэнтралізацыяю дзяржаваю, ня гледзячы на тое, што ў Польшчы 50 проц. жыхарства—нацыянальныя меншасьці. Польшча не захацела стаць фэдэрацыйнаю дзяржаваю. Фэдэрацыя патрабуе некаторых прадпасылак, а іменна—узаемнае згоды. Польшча-ж з самага пачатку заняла «незамірымую пазыцыю», пасварылася з беларусамі, украінцамі, немцамі, яўрэямі і літоўцамі. Момант для арганізацыі фэдэрацыі быў прапушчан. Я лічу яго беззваротна страчаным.

Што-ж датычыць таго, ці захаваем мы нашую незалежнасьць, і ці не пагражае нам з боку Савецкае Расеі небясьпека накшталт тае, якая існавала з боку царскае Расеі, дык гэта пытаньне тэарэтычнае і мае чыста акадэмічны характар. Я зазначаў, што пакуль-што нам пагражае польская небясьпека, а не расейская".

Карэспандэнт ТАСС дае далей запытаньне: „Ці можна з выказаньня вамі рабіць вывад, што вы лічыце магчымымі зазначаныя тэндэнцыі ў палітыцы СССР?»

На гэта Вальдэмарас адказаў: „Я казаў, што гэтае пытаньне акадэмічнае, а не рэальнае. Я ня зьбіраюся займацца мэтафізыкаю і варажыць, што будзе з Савецкаю Расеяю праз 50 ці 100 гадоў. Калі займацца мэтафізыкаю, дык таксама можна было б выказаць небясьпеку і з адносінах да Нямеччыны. Я ізноў кажу, што Літва ў гэтым выпадку лічыць рэальнаю польскую небясьпеку, а расейскую».

Вальдэмарас аб новай канстытуцыі Літвы.

КОЎНЯ, 30-5. У гутарцы з замежнымі карэспандэнтамі Вальдэмарас паведаміў, што ў Бэрліне дасягнута згода з Польшчаю наконт мясцовых зносін сялян, якія маюць зямлю, падзеленую дэмарканыйнай лініяй. Згода будзе падпісана ў Бэрліне ці ў Жэневе.

Перайшоўшы да пытаньня наконт зьмены літоўскае канстытуцыі, Вальдэмарас заявіў, што парадак абраньня прэзыдэнта» будзе ўстаноўлен спэцыяльным законам.

«Урад,—сказаў Вальдэмарас,—хоча, каб дзяржаўная рада была склікана перад выбарамі ў сойм і каб яна падрыхтавала закон аб парадку абраньня прэзыдэнта.

На запытаньне, як глядзіць Чэмбэрлен на абвяшчэньні Вільні сталіцаю Літвы, Вальдэмарас адказаў, што Чэмбэрлен адзначыў запікаўленасьць Англіі да захаваньня спакою на Ўсходзе Эўропы.

Нарэшце, Вальдэмарас заявіў, што да вырашэньня вільненскага пытаньня польска-літоўская згода немагчыма.

КАМУНІСТЫЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ Ў ЧЭХА-СЛАВАКІІ.

ПРАГА, 25-V. Учора ў рабочых кварталах Прагі адбыліся наладжаныя чэха-славацкай камуністычнай партыяй дэманстрацыі пратэсту проці забароны рабочае спартакіяды. Сёньня дэманстрацыі пратэсту адбыліся ў цэнтре гораду. Паліцыя некалькі разоў спрабавала вызваліць вуліцы, але нічога не магла зрабіць. Параганяныя паліцыяй масы дэманстрантаў зьбіраліся ізноў і праводзілі далей дэманстрацыю пад выгукамі „нікай жыве спартакіяда".

Антыітальянскія дэманстрацыі ў Югаславіі.

ВЕНА, 29-У. Водлуг паведамленьняў, у шмат якіх гарадох Югаславіі ізноў адбыліся антыітальянскія дэманстрацыі. Італьянскі пасланьнік у Югаславіі заявіў міністэрству замежных спраў пратэст і патрабаў неадкладнага «здавальненьня». Міністр замежных спраў Марынковіч абяцаў, што ўрад ужыве меры проці дэманстрантаў.

Камітэт Барбюса па абароне Бэла Куна.

ВЕНА, 29-У. Прыехалі францускі адвакат Віляр і архітэктар Гурдэн, якія выступаюць ад імя камітэту Барбюса. Водлуг паведамленьняў друку, прыбыўшыя хочуць заснаваць сувязь з кампэтэнтнымі аўстрыйскімі ўстановамі і выказаць пункт гледжаньня камітэту Барбюса ў пытаньні аб справе Бэла Куна.

Міністр юстыцыі адмовіўся іх прыняць.

ПРЭЧ ПІЎНЫЯ З РАБОЧЫХ РАЙЁНАЎ.

ЦЬВЕР, 28-5. Рабочыя і работніцы цьвярскіх тэкстыльных фабрык «Пралетаркі» і «Вагжанаўкі» на апошнім шырокім сходзе пастанавілі прасіць губыканком зачыніць усе піўныя, якія знаходзяцца ў фабрычным райёне.

ПРАЦЭС ШАХЦІНСКІХ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ

Шкоднікі наўмысьне скарачалі здобыч вугалю ў капальнях.—Фанты атручваньня рабочых у неправераных капальнях. — Зьдзекі і збойствы палонных чырвонаармейцаў і гарнякоў.

ПАКАЗАНЬНІ СЬВЕДАК АБ УЧЫНКАХ НАШЫВОЧНІКАВА.

Як спэцы сустракалі інжынэраў-камуністаў.

МАСКВА, 29-5. У канцы ранішняга пасяджэньня шахцінскага працэсу 29-га мая суд апытаў сьведку Дамненка, бліжэйшага памоцніка абвінавачанага Нашывочнікава. Дамненка апавядае, што калі ён прыехаў у капальню «Пралетарская Дыктатура», дык камуністы, якія былі ў кіраўніцтве капальняў, і прафесіянальная арганізацыя хацела навязаць яго загадчыкам капальні. Але старэйшы тэхнічны пэрсанал, як відаць, не хацеў гэтага. Умовіліся, што ён будзе намесьнікам.

Нашывочнікаў,—гаворыць сьведка,—адразу-ж сустрэў мяне вельмі ня ветліва. Нашывочнікаў вельмі часта дамагаўся, каб сьведка ня быў дапушчан да працы непасрэдна ў капальні, а загадваў толькі працаю на паверхні. Дамненка ў выніку дамогся, што яму было загадана перайсьці на горныя работы. У працэсе азнаямленьня, якое цягнулася два тыдні, сьведка заўважыў, што парадак вядзеньня горнае працы зусім не адпавядае правілам. У галоўнай капальні,—гаворыць сьведка,—самы магутны пласт распрацоўваўся так, што я проста дзівіўся. Аб гэтым сьведка ня раз папераджаў і Касьпенка, і Калганава, і Нашывочнікава, але праца вялася ў тым-жа духу.

У той час,—апавядае сьведка,—быў на капальні малады інжынэр Ліўшыц. Калі Ліўшыц пачаў праводзіць працу, водлуг правіл горнага мастацтва, дык ад яго пастараліся пазбавіцца.

Наконт працы на тым вучастку капальні, дзе працаваў Ліўшыц, Дамненка гаворыць: увесь гэты вучастак сьведома тармазіўся, не зважаючы на тое, што ён даваў 60, а іншы раз і 70-80 процантаў здобычу ўсяе капальні. Капальня давала 45-50 тысяч пудоў у суткі, а магла-б даць 150 тысяч пудоў.

На адказнасьці Нашывочнікава сьмерць рабочага Зайцава.

Далей сьведка апавядае аб тым, як сьвядома немэтазгодна выкарыстоўваліся ў капальні № 2, дзе працаваў Нашывочнікаў, урубовыя машыны.

Дамненка падае некалькі выпадкаў, як Нашывочнікаў стараўся даказаць, што камуністы—ворагі рабочых.

Моцна абурыла сьведку адно злачынства, у якім ён вінаваціць выключна Нашывочнікава і Васільлева. Гэта было, калі захлынуўся на сьмерць адзін рабочы—Зайцаў. Гэта здарылася таму, што, не зважаючы на суровы загад Васільлеву з боку сьведкі праверыць капальню, бо яна ў працягу 2-3 дзён не праветрывалася, гэты загад ня быў выкананы. Рабочыя былі пасланы на працу і ў выніку—адзін выпадак сьмерці і каля 50 чалавек атручаных, якія вымагалі лячэньня ў больніцы. На запытаньне, як захлынуўся рабочы Зайцаў, Нашывочнікаў катэгарычна адхіляе гэты факт, паведаны сьведкам Дамненка. Такую-ж заяву зрабіў і Васільлеў.

Сьведка Ліўшыц апавядае аб пяжкіх умовах працы на ўступах і аб кепскай вэнтыляцыі на капальні, аб чым ён ня раз казаў Нашывочнікаву. Але яго заўвагі заставаліся без адказу.

У зьвязку з тым, што абвінавачаныя адхіляюць факт няшчаснага здарэньня з рабочым Зайцавым і атручаньнем іншых рабочых у капальні, дзяржаўны абвінаўвач узьнімае хадайніцтва, каб было праведзена дадатковае следзтва на месцы наконт факту, паведанага суду сьведкам Дамненка, і быў дадзен загад пра пракурорскі нагляд апытаць сьведак аб гэтым факце, а таксама вынайсьці факт запісу ў кнізе выпадку, аб якім казаў сьведка Дамненка.

У сваю чаргу абаронца Нашывочнікава падае хадайніцтва высьвятліць гэты-ж факт і затрабаваць кнігу запісаў няшчасных выпадкаў на капальні. Суд пастанаўляе задаволіць хадайніцтва абвінавачаньня і абароны.

На гэтым раніцнае пасяджэньне 29-га мая лічыцца скончаным.

„Гэта вам не саўдэпія".

МАСКВА, 29-5. На вечэрнім пасяджэньні шахцінскага працэсу 29-га мая сьведка Петракоў апавядае, што ён у ліку іншых чырвонаармейцаў першага маскоўскага камуністычнага палка трапіў у палон да белых. Частка палонных чырвонаармейцаў была накіравана на Петрапаўлаўскую капальню, дзе ў гаты час капальняй загадваў Нашывочнікаў. Петракоў апавядае аб тых страшэнных умовах, у якіх прышлося працаваць палонным. Яны былі баз вопраткі і абутку. Іх амаль-што марылі голадам. Людзі літаральна вар'яваліся. У такіх умовах на капальні працавалі і гарнякі. Вінаватым у гэтым сьведка лічыць Нашывочнікава. Яго абыходзіны як з рабочымі, так і з палоннымі былі агідныя. Некалькі чалавек было спаралізавана ад яго пабоў. Нашывочнікаў біў і самога сьведку, прычым ад пабоў у яго стала рана, якую патым прышлося зырэзаць. У шмат якіх палонных былі адмарожаны рукі і ногі. Палонных чырвонаармейцаў пасылалі на толькі на працу ў капальні, але прымушалі нават грузіць вугаль у вагоны, а вугаль у гэты час узмоцнена вывозіўся заграніцу. Салдаты, якія ахоўвалі палонных, спачувалі апошнім і аддавалі ім нават свой паёк.

Таварышы,—пеяк сказалі палонныя сваім вартаўнікам,—вашым вугалем вы плаціце чужаземцам за снарады. Гутарку гэтую пачуў Нашывочнікаў і ўсім дасталася, асабліва сьведцы. А на другі дзень два палонных былі знойдзены з прабітымі галавамі.

1-га мая 1919 г. палонныя чырвонаармейцы парашылі адсьвяткаваць пралетарскае сьвята—паціху, у сваім бараку. Схаваліся ў кут і сьпявалі рэвалюцыйныя сьпевы. Раптам увайшоў адзін з вартаўнікоў, георгіеўскі кавалер. Палонныя замяшаліся, але вартаўнік сказаў ім: „Вы мяне ня бойцеся—я сам бальшавік, бойцеся Нашывочнікава. Была там і мэдыцынская сястра, якая таксама добра абыходзілася з палоннымі. Водлуг слоў сястры, сьведка перадае, што афіцэры бывалі ў Нашывочнікава, наладжвалі ў яго п'янкі. Неяк раз афіцэры прывезьлі сястру з кватэры Нашывочнікава зусім п'яную. Самымі ўлюбёнымі словамі Нашывочнікава былі—«саўдэпіўская морда», «гэта вам не саўдэпія» і інш.

Нашывочнікаў, які раней, усё адхіляе. Допыт Нашывочнікава, заняўшы амаль 2 дні скончыўся. Падагульваючы тлумачэньні Нашывочнікава, зьвязаныя з паказаньнямі апошняга сьведкі, т. Крыленка падкрэсьлівае, што падсудны па сутнасьці пацьвярджае ўсё, у чым яго абвінавачаюць.

„САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ ПА-ЗА ФРАКЦЫЯМІ".

Перад судом падсудны Васільлеў, горны тэхнік. Аб ім ужо няраз спаміналася ў парадку судовага сьледзтва.

Гэта пра яго апавядаў Беразоўскі, як пра інжынэра, якога за грубыя абыходзіны рабочыя хацелі забіць, але потым толькі вывезьлі з капальні на тачцы. Нават сам ён ужо зьяўляўся перад сталом судовае прысутнасьці і даючы запытаньні некаторым з падсудных, рэкамэндаваўся «сацыял-дэмакратам па-за фракцыямі».

Тав. Вышынскі пытаецца ў Васільлева, ці ня быў ён ужо пад судом.—Быў—адказвае Васільлеў: гэта адзначана ў маёй справе. Мяне прыцягвалі да адказнасьці за ўдзел у бандзе Кучума, абвінавачвалі ва ўдзеле ў Елізаветінскай арганізацыі.

На запытаньне Крыленка, што гэта за арганізацыя, Васільлеў адказвае: і тады гэтага ня ведаў і зараз ня ведаю—здаецца контрраволюцыйная. На запытаньне Вышынскага, чым гэта для Васільлева скончылася, падсудны адказвае, што яго прысудзілі ўмоўна на год.

— А колькі вас разоў наогул арыштоўвалі,—пытаецца т. Крыленка.

— Дзесяткі разоў,—адказвае падсудны.

— Якія-ж прычыны былі, што вас дзесяткі разоў арыштоўвалі.

— Усё па тэй-жа кучумаўскай справе.

Спроба судовае прысутнасьці выявіць, за што ўласьціва, «дзесяткі разоў» арыштоўвалі Васільлева, калі яго ўдзел у кучумаўскай справе быў ужо разглядзеў судом і ліквідаваны, выклікае вельмі заблытанае апавяданьне Васільлева аб тым, як ён папаў у рукі банды Кучумава і як Кучумав назначыў яго атаманам станіцы Кацярынінскае. Гэтая фантастычная гісторыя набывае блытаны характар, калі Васільлеў у далейшым апавядае наконт таго, як ён толькі з адным вартаўніком, дадзеным яму Кучумам, вярнуўся да чырвоных.

Суд пераходзіць да допыту сьведак працы Васільлева.

Сьведка Вахлічаў пачынае свае паказаньні так: Я ведаю Васільлева з 1915 году. Ён быў грубы, займаўся мардабіцьцём. Мяне ён таксама хацеў пабіць. Мне было тады 13 гадоў. Ён так груба абыходзіўся з рабочымі, што ў 1917 г. рабочыя хацелі забіць Васільлева. Яго не забілі толькі дзякуючы абароне Беразоўскага, аднак вывезьлі на тачцы.

Іскравы малюнак шкодніцтва Васільлева дае наступны сьведка Галалобаў.

Абвяшчаецца перарыў пасяджэньня да 10 гадз. раніцы 30 мая.

Паказаньні сьведкі--шахцёра Кулікава.

11-ты дзень шахцінскага працэсу. На раніцішнім пасяджэньні 30-га мая скончыўся допыт падсуднага Васільлева. Да устаноўленае ўжо судовым дазнаньнем характарыстыкі падсуднага далучацца яшчэ 2—3 яскравых рыскі. Васільлеў—ранейшы меншавік. З партыі, як ён кажа, фактычна выбыў у 1909 г., але публічна заявіў пра гэта толькі ў 1923 г., агаласіўшы свой ліст у газэце.

Дапытваецца сьведка Кулікаў, шахцёр. Ён кажа, што Васільлеў быў вельмі грубым з рабочымі. Пры Васільлеве вельмі неахайна праводзілася праца, а гэта выклікала абвалы, у капальні ўжываліся зусім нягодныя скляпеньні.

— А ці пагражала гэта жыцьцю рабочых,—пытае ў сьведкі т. Крыленка.

— Але, такі парадак працы пагражаў жыцьцю рабочых,—адказвае Кулікаў.

— А ці зварочвалі вы на гэта ўвагу падсуднага Васільлева?

— Так, зварочваў, але ён казаў, што няма калі за гэтым сачыць.

— Ці ведае сьведка,—пытае Крыленка,—пра выпадак на шахце, дзе працаваў Васільлеў, калі ўчадзела некалькі рабочых і насьмерць захлынуўся Зайцаў?

— Гэта выпадак здарыўся пасьля рамонту капальні,—адказвае сьведка,—калі ў працягу некалькіх дзён капальня не праветрывалася. У неправераную капальню былі ўпушчаны рабочыя, з ліку якіх шмат учадзела, а забойшчык Зайцаў быў выцягнуты з капальні ляжыўм.

Пасьля гэтых слоў сьведкі Кулікава т. Крыленка зварочваецца да падсуднага Васільлева з запытаньнем:

— Скажэце, Васільлеў, вы і зараз ня ўспомніце пра выпадак сьмерці забойшчыка Зайцава?.

— Пра Зайцава я чую першы раз,—адказвае Васільлеў.

Паказаньні падсуднага Бяленкі.

Суд пераходзіць да допыту падсуднага Бяленкі.

Бэндыкт Бяленка—горны тэхнік. Вінаватым ён сябе не прызнае. Ён сын селяніна-парабка. У 1914 годзе скончыў тэарэтычны курс ніжэйшае Паўлаўскае горнае школы. У 1916 годзе там-же прайшоў практычны курс.

Бяленка апавядае аб тым, што пры аступленьні белых большая частка тэхнікаў выехала, а ён, будучы у той час у горным аддзеле мясцовага рэвалюцыйнага камітэту, ораў актыўны ўдзел у выратаваньні рудзікоў, якім пагражала затапленьне.

Адхіляючы высунутыя яму абвінавачаньні ў шкодніцтве, Бяленка кажа: «Я цяпер разумею, што быў падмануты сваімі кіраўнікамі таксама, як і ўсімі арганізацыямі, якія іх пахвалялі. Я ніколі не задумоўваўся, ці правільная тая ці іншая праца, тое ці іншае заданьне, якія мне даручаліся Калганавым, Бабенкам і Гайрушанкам. На праверку ў мяне ня было часу, а часам і ведаў. Я—малодшы тэхнічны склад».

У гэтым тоне Бяленка праводзіць усе свае паказаньні. З аднаго боку, ён не адхіляе, што ў працы яго было шмат непарадкаў, але гэтыя непарадкі—выпадковасьць, якая залежыць ад таго, што, як літаральна кажа Бяленка, „горная справа не навука, а мастацтва". Малодшы тэхнічны склад, зазначае Бяленка, адчуваючы сябе невінаватым і не заўважаючы злачынства начальства, даваяў сабе часам, абараняючы самі х сабе, абурваецца на рабочых. Але я катэгарычна заяўляю, што ніколі ніякае шкоднікае працы не праводзіў і ніколі ня быў ворагам рабочае клясы.

Пасьля напамінаньня сябра суду Южна-Васільлева падсудны Бяленка апавядае ўжо вядомы па судовым дазнаньні выпадак, як быў пасланы на падрыўную працу ў капальню капальнічык Каранкоў, які, як паказваюць рабочыя, быў п'яным і з гэтае прычыны загінуў у часе выбуху. Бяленка не адхіляе факту, але кажа, што Каранкова ён ня бачыў там, а калі ён сапраўды быў п'яным, дык вінаваты ў дапушчэньні п'янага на працу дзесяцінік Талмачоў. У зьвязку са сьмерцю капальнічыка Каранкова падсудны Бяленка быў арыштаваны, дапытаны і праз 2 тыдні, 1-га мая 1927 г., вызвален.

Супроць катаржнага прысуду над Грамадой.

Найшчырэйшае прывітаньне змаганьнікам!

— Мы, АСЬВЕТНІКІ РЭЧЫЦКАГА РАЙЁНУ, з вольнай Савецкай Беларусі шлём сваё найшчырэйшае прывітаньне змаганьнікам за лепшую долю працоўных Заходняй Беларусі—членам Беларускай Сялянска-Рабочай Грамады. Наближаецца час, калі рухне стары сьвет, і настане братэрства народаў пад сьцягам камунізму. Мы патрабуем вызваленьня з катаргі ўсіх грамадаўцаў, заседжаных польскім фашысцкім судом.

Няхай жыве і шырыцца рэвалюцыя ва ўсім сьвеце!

Слава грамадаўцам!

Усе на дапамогу вязьням капіталу!

Грамадзяне ГОРАЦКАГА РАЙЁНУ, Аршанскай акр., рашуча пратэстуюць супроць зьдзекаў шпікоў і жандармэрыі над працоўнымі Заходняй Беларусі, дзе мучацца тысячы сыноў працоўнае грамады.

— Мы патрабуем вызваленьня несправядліва засуджаных грамадаўцаў!

Прэч акрываўленыя рукі ад беларускага народу!

Усе на дапамогу вязьням капіталу!

Усе ў шэрагі Мопр'у!

Патрабуем вызваленьня засуджаных.

— МЫ, ПРАЦОЎНЫЯ БАГУШЭВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, Бярэзінскага райёну, рашуча пратестуем супроць катаржнага прысуду, які вынесен польскім фашысцкім судом над лепшымі сынамі Заходняе Беларусі—грамадаўцамі. Мы патрабуем безадкладнага вызваленьня ўсіх засуджаных па справе Грамады. Няхай ведаюць польскія паны, што рэпрэсіямі і гвалтам їм ня ўдасца задушыць рэвалюцыйна-нацыянальны рух у Заходняй Беларусі. Мы заклікаем сялян Польшчы і ўсяго сьвету ўзьняць свой голас у абарону невінна засуджаных.

Няхай жыве Беларуская Грамада!

Прэч гвалт і зьдзекі!

Агульны сход РАБОЧЫХ ЛЕСАПІЛЬНАГА ЗАВОДУ «СПАРТАК» І СЯЛЯН ПАСЁЛКА ГРАДЗЯНКА з абураньнем пратэстуе супроць жорсткай расправы польскага фашысцкага суду над Беларускай Сял.-Раб. Грамадой.

— Мы заклікаем рабочых і сялян Савецкай Беларусі і ўсяго Савецкага Саюзу ўзьняць свой магутны голас пратэсту супроць зьдзеку польскіх паноў над рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі.

Ганьба фашысцкім судзьдзям!

Шчыры прывет засуджаным грамадаўцам!

Катаржнымі прысудамі ня спыніць рэвалюцыйнага руху.

— Заслухаўшы інфармацыю аб катаржным прысудзе над членамі Беларускай Грамады, мы, працоўныя СІРОЦІНСКАГА РАЙЁНУ, Віцебскай акр., зазначаем, што дарэмна фашысцкі суд Польшчы імкнецца задушыць рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Беларусі за сваё вызваленьне. Яму гэта ня ўдасца!

Мы рашуча пратэстуем супроць катаржнага прысуду над правадырамі Беларускай Грамады і патрабуем безадкладнага іх вызваленьня.

Няхай жыве перамога працоўных ва ўсім сьвеце!

З ПОЛЬСКАЙ ПРЭСЫ.

Напруджанасьць палітычнага паветра.

У Кракаве з даўняга часу выдаецца кансэрватыўная газэта «Час». Супрацоўнічаюць у ёй пераважна прафэсары кракаўскага ўніверсытэту. У сучасны момант „Час" бароніць палітыку ўраду Пілсудзкага і выступае проці сойму. Некалькі тыдняў таму назад «Час» заклікаў зрабіць у Польшчы новы дзяржаўны пераварот. Але вось в Варшаву прышлі весткі аб пагаршэньні здароўя марш. Пілсудзкага і магчымых зьменах ва ўрадзе. Тады «Час» зьмяніў свой рэзкі тон у адносінах да сойму і стаў жаліцца на тое, што—

„палітычная лінія ўраду ня ясная, галоўным чынам, ад моманту хваробы марш. Пілсудзкага, унутраная сытуацыя перасычана электрычнасьцю і яна можа разрадзіцца вельмі лёгка".

І вось той самы прафэсарскі кансэрватыўны „Час", які гатоў быў на новы пераварот, стаў біць адбой і шукаць выхаду,—

«які запэўніў-бы дзяржаву на ўсякі выпадак праўны парадак і нармальныя ўнутраныя стасункі. Разгляд бюджэту ў чэрвені мог-бы вельмі многа гэтаму дапамагчы, калі-б утварыўся кантакт і паразуменьне між групамі, якія ня імкнуцца да [illegible]

Гэты раптоўны зварот кансэрватыўнага „Часу" аб помачы да тых, каго ён толькі што паневяраў і над кім зьдзекаваўся, выклікаў з боку хадэцкага «Глосу Народу» адказ досыць саркастычнага зьместу. „Глос Народу" робіць такія ўвагі:

«Цяпер толькі, калі сіла «адзінкі» (блёк супрацоўніцтва з урадам. Рэд.) аказалася значна падарванай праз «заслабеньне п. марш. Пілсудзкага», цяпер толькі „Час" пачынае разумець патрэбу зблізэньня «адзінкі» з іншымі групамі. Перад гэтым ён пісаў, што гэта кампрамэтавала-б «адзінку». Цяпер-жа ёй «карона з галавы на зваліцца"...

У апошній карэспандэнцыі з Варшавы (ад 25 мая) «Час» галосіць:

«Сучасная сытуацыя прадстаўляецца зусім няпэўнай. Цяпер усё залежыць ад стану здароўя маршалка Пілсудзкага, гэта значыць—ад чыньніка на аблічальнага».

Як бачым, у панскай Польшчы сытуацыя ізноў зрабілася «зусім няпэўнаю» і залежыць... ад стану здароўя марш. Пілсудзкага. У палітычным паветры ізноў адчуваецца напружанасьць. Усё гэта вельмі характэрна для Польшчы, асабліва пасьля маёвага перавароту.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

ЯК ІДЗЕ САМААБКЛАДАНЬНЕ.

(Па вестках на 23-е мая).

АКРУГІ	Заданьне	Прыйнята на праводзкіх сходах	%% да заданьня	Паступіла	%% да прыйнятай сумы
Мазырская	210.000	244.690	122,3	203.011	83,0
Аршанская	350.000	350.002	100,0	263.716	75,3
Віцебская	250.000	262.328	104,9	156.952	59,8
Бабруйская	500.000	410.200	82,0	237.540	57,9
Полацкая	190.000	193.449	101,8	77.850	40,2
Магілеўская	500.000	417.447	83,5	167.878	40,2
Гомельская	350.000	347.348	99,2	130.652	37,6
Менская	560.000	441.805	78,9	119.662	27,1
УСЯГО па БССР	2.910.000	2.667.269	91,7	1.357.261	50,9

Наша хлебная фабрыка.

Магілеў. Пабудова хлебнага заводу магілеўскім Цэнтральным рабочым кааператывам задумана даўно. З заводам сьпяшыліся, нават было ад Акрвыканкому заданьне—пабудаваць яго да такога-та тэрміну.

Але праўленьне ЦРК памятала прыказку: «торопись не спеша». І яно мела рацыю: дзякуючы адцяжцы, яно атрымала магчымасьць укласьці ў завод вельмі значныя сродкі, адшукаць лепшую сыстэму і даць гораду такі хлебазавод, які патрэбен і заслугоўвае гэтай назвы.

Старшыня праўленьня наведаў вялікія гарады, дзе знаёміўся з існуючымі „фабрыкамі хлеба". Даволі сказаць, што сыстэму пячэй абіралі тры разы, пакуль, нарэшце, не застанавіліся на пячах акумулятарнай сыстэмы інжынэра Джорагава, якія даюць вялікую эканомію ў паліве, больш дзяшовыя і іх лёгка абслугоўваць.

Зараз прыстасаваньне будынку пад хлебазавод закончана і ідзе ўнутранае яго абсталяваньне, якое будзе закончана да 1 кастрычніка.

Пры рабоце ў тры зьмены на 6 пячах пры 30 рабочых, завод зможа даць ад 1800 да 2000 пудоў хлеба (чорнага і белага) у суткі. Гэтае колькасьці зусім даволі, каб забясьпечыць цалком патрэбу гораду ў хлебе (цяперашняя хлебапякарня ЦРК вырабляе ў 2 зьмены пры 50 рабочых 250 пудоў хлеба).

Якое павялічэньне вытворчасьці на аднаго рабочага дасьць новы мэханізаваны хлебазавод,—бачна з наступнага параўнаньня: зараз існуючая хлебапякарня выпушчае 5 пудоў хлеба на 1 рабочага, хлебазавод дасьць 60 пудоў. Павялічэньне ў 12 раз! **К. Л.**

Фабрыка без кіраўніка.

Гомель. Упяршыню за 5 гадоў фабрыка цукерак «Просвет» спынілася на шасьць тыдняў. Асноўная прычына—адсутнасьць збыту прадукцыі. На фабрыцы маецца запас тавараў на 115 тысяч рублёў.

Аднак, пры належнай увазе трэсту «Сельпищепром» да працы фабрыкі можна было папрадзіць гэткае доўгае спыненьне яе вытворчасьці. На фабрыцы няма належнага кіраўніка. Дырэктар трэсту, прыняўшы на паперы на сябе кіраўніцтва фабрыкай, фактычна ўсклаў кіраўніцтва на кладаўшчыка, які ня можа справіцца з гэткай вялікай працай.

Трэст ня выкарыстаў у належнай меры канъюнктуры рынку, калі попыт на вырабы фабрыкі ня поўнасьцю здавальняўся. Ня былі ў час утвораны дагаворы з аблбнымі спажыўцамі і ў выніку пакупцы адышлі, бо ньязяліся з іншымі фабрыкамі.

Трэст замест таго, каб прыняць меры да абсталяваньня вытворчасьці, да выпрацоўкі прадуктаў масавага попыту—купіў партыю прадуктаў іншых фабрык на 25 тысяч рублёў. Зьмяншэньне на гэткую суму звароту адбілася на фінансавым становішчы фабрыкі.

Пры мэханізацыі фабрыкі Трэст ня ўлічыў выпрацоўку прадуктаў з магчымасьцю збыту. Прадукцыі выпушчаецца на суму 60-70 тысяч рублёў у месяц, а шэмесячны збыт дае 30-35 тысяч рублёў і магчыма, што ў далейшым могуць быць замінкі ў збыце.

У камэрцыйнай працы трэсту няма належнай пастаноўкі і ўвязкі. Трэстам была адасланa партыя цукерак на 25 т. руб. у тільготных яшчыках. Ад гэтай аперацыі трэст страціў 7000 р. Нядаўна на фабрыцы ня было скрынь і цукеркі кідаліся ў кучу, у выніку чаго было шмат браку.

ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ НА КАНТРАКТАЦЫЮ ПАСЕВАЎ.

[illegible], 30-5. Атрыманы дадатковыя сродкі на кантрактацыю пасеваў: 4500 руб. на семя-лёну, 3000 р. на кантрактацыю лёну-даўгунцу і 1875 руб.—на насеньне канюшыны. Сродкі гэтыя ўжо разьмеркаваны па нізавой сетцы сельска-гаспадарчай кааперацыі.

ЗАГАТОЎКА ЭКСПАРТНАЙ СЫРАВІНЫ.

Ворша 30-5. Загатоўка яек пачалася з 10-га мая. Да 20-га мая ўжо загатоўлена 440 скрынак яек. **Адзін вагон ужо адпраўлен за межы.**

За апошні час па акрузе таксама ўзмацнілася паступленьне пянькі і лёну-валакна.

ЗАГАТОЎКА ЯЕК.

Бабруйск, 30-V. Загатоўкі экспартных яек за апошні час прынялі шырокі размах. За апошнія 10 дзён аддзяленьнем Дзяржгандльбелу загатоўлена 461 тысяча штук яек. Загатоўчы апарат не спраўляецца з прыёмкай, запрашваюцца новыя кадры спэцыялістых па гэтай працы. Усяго за веснавы час аддзяленьне Дзяржгандльбелу загатовіла 1.597 тысяч штук яек.

СЯЛЯНСТВА АРГАНІЗУЕЦЦА.

Бабруйск, 30-У. На працягу апошніх месяцаў на Бабруйшчыне арганізавана 16 новых машынных таварыстваў і 22 малочныя арцелі. Новыя арганізацыі прыступілі да працы.

СЯЛЯНКУ НА АДКАЗНУЮ ПРАЦУ.

Магілеў 30-5. На пасаду намесьніка загадчыка акруговага Земаддзелу прызначана сялянка **Ліўшунова**, якая даготуль працавала старшынёю Куракаўшчынскага сельсавету.

ДОМ АДПАЧЫНКУ ДЛЯ САМАТУЖНІКАЎ.

Бабруйск, 30-У. З 10 чэрвеня саматужна-прамысловая страхавая каса адчыняе дом адпачынку ў в. Ясны Лес, Бабруйскага р. Дом адпачынку разьлічан на 70 чалавек.

ЭЛЕКТРАФІКАЦЫЯ МЯСТЭЧКА

Капыль, 30-У. Атрымана з Менску 10000 руб. доўгатэрміновага крэдыту на электрафікацыю нашага мястэчка. Пры існуючым тэхнічным прадпрыёмстве будзе абсталявана электрастанцыя, якая мяркуе даць сьвет ня толькі ў мястэчка, але і ў бліжэйшыя вёскі.

ВЫНІКІ ТЫДНЯ АШЧАДНАСЬЦІ.

Мазыр, 30-У. Водгук апошніх вестак, за тыдзень з 15 да 22 мая па Мазырскай акрузе лік укладчыкаў у касах ашчаднасьці павялічыўся на 762 чал., якімі ўнесена 4000 руб. Наогул-жа за гэты тыдзень сума ўкладаў у касах павялічылася на 20000 руб.

Віцебск, 30-У. За тыдзень ашчаднасьці па Віцебшчыне ў касах ашчаднасьці лік укладчыкаў узрос на 280 чал., якімі ўнесена да 8000 руб. Усяго за час з 15 да 22 мая ўклады ў касах ашчаднасьці ўзраслі на 30000 руб.

ДАСЯГНЕНЬНІ РАДЫЁФІКАЦЫІ.

Ворша, 30-V. У сучасны момант мы маем немалыя дасягненьні ў справе радыёфікацыі ў нашай Аршанскай акрузе.

Зараз маецца ўжо 140 установак, з гэтай колькасьці ў 1928 г. устаноўлена 35. У горадзе маецца 15 радыёўстановак, якімі карыстаюцца калектыўна, і 50 у прыватным карыстаньні. Па райёнах 23 радыёўстаноўкі ў калектыўным карыстаньні і прыватных—52.

За 1928 год ужо арганізавана новых 8 ячэек і таварыства радыёпрыхільнікаў з лікам 75 сяброў.

„ГЕРОЙ ТРУДА" ЗЬНІЖАЕ.

Нядаўна з РСІ СССР у Менск прыяжджаў тав. Іканомаў, каб наладзіць у Беларусі стандартызацыю. Хацеў стандартызаваць фармат аркушу паперы, фармат канвэрта, канцэлярскага стала.

І чаго ён прыяжджаў у Беларусь? Ехаць зусім ня трэба было, мы і без яго можам стандартызаваць.

Універсальны прыклад — папяровая фабрыка «Герой Труда» ў Гомельшчыне. Праўда, «стандартызацыя» у «Героя Труда» спэцыфічная, але як умеем, так робім.

У фабрыцы стандартызацыя па чыну: трэсту папяровай прамысловасьці—адны канвэрты, прычым самыя вялікія; для ЦВК—другія, троха меншыя; для СНК—трэція, яшчэ меншыя; для ВСНГБ—чацьвертыя, яшчэ меншыя і так да сельсавету, у якім знаходзіцца фабрыка „Герой Труда".

Калі ў самы меншы канвэрт улезе аркуш паперы перагнуты два разы, можна ўявіць сабе велічыню канвэрта для самага большага начальніка—трэсту папяровай прамысловасьці. Кожны канвэрт мае свой друкаваны адрас. Ляжаць канвэрты ў спэцыяльных шафах і, у разе патрэбы, вельмі хутка адшукваюцца: спэцыяльны штатны супрацоўнік бярэ альфабэт і гладзіць. Напрыклад, трэба знайсьці канвэрт у «окротделение союза». Штатны супрацоўнік бяжыць да шафы, у якой ляжаць канвэрты на «О» і адразу ёсьць гатовы канвэрт. Нават адразу пісаць ня трэба.

Такая сыстэма ўведзена для выкананьня дырэктывы аб 20 проц. зьніжэньні выдаткаў.

У гэтым напрамку фабрыка шмат робіць: замест таго, каб пасылаць у трэст кожную паперку асобна, фабрыка зьбірае паперкі цэлы месяц, пасьля паложыць іх у адзін канвэрт і пашле express'ам. Чаму express'ам—гэта толькі аднаму дырэктару фабрыкі вядома. Гэта сакрэт, якога ня ведае нават асабісты сэкратар дырэктара.

Нам здаецца, што ўсе 14 паперак, якія фабрыка паслала трэсту ў пакеце № 229, можна было за 3 капейкі адправіць адчыненаю бандэрольлю. Фабрыка-ж аддала толькі на маркі 1 р. 58 кап.

Трэст папяровай прамысловасьці добра зрабіў, што на гэтым-жа канвэрце напісаў напамінак фабрыцы аб зьніжэньні адміністрацыйна-упраўленцкіх выдаткаў. Аднак, памесьнік кіраўніка трэсту т. Чорны з такой пастаноўкай справы не згаджаецца. Ён лічыць, што пісаць фабрыцы на канвэрце—абраза для папяровага трэсту. Каб які іншы трэст, тады другая справа, а папяровы?..

Які-ж ён папяровы трэст, калі паперы шкадуе?

Так і не падпісаў паперкі.

А пры падліку зьніжэньня выдаткаў скажа:

—«В силу аб'ективных причин»...

Улас.

ВЁСКА НА ШЛЯХУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Камуна ідзе наперад.

На былой абшарніцкай зямлі пана Тышкевіча ў 1924 г. арганізавалася сельска-гаспадарчая камуна «Першага мая».

Да 1924 г. маёнтак належыў акрэ, і калі прышлося перадаваць яго камуне, дык ня было чаго. Засталася адна толькі малатарня з дзеравяным прыводам.

Зямлі ў камуне налічваецца 109 дзесяцін, сенажаці балотнае—45 дзес., 4 дзес. сухадольнае.

Пачынаць працу было надта цяжка. Прышлося патраціць шмат сілы і сродкаў, але

першамайцы гэтага ня спужаліся.

За свае ўласныя сродкі купілі каня і карову і з гэтаю жывёлаю пачалі сваю працу. Да арганізатараў пачалі далучацца новыя і новыя сем'і. Камуна арганізавалася стойкая.

У сучасны момант камуна налічвае 32 сем'і, 16 рабочых коняй, 2 жарабят, 2 жарабцы палешчанай породы, 22 дойныя каровы, 2 быкі-вытворцы, жнэйрку, малатарню, сеялку, сарціроўку «Трыумф». Перайшлі па сяміпольны севазварот.

ЯКІЯ СЕЮЦЦА КУЛЬТУРЫ.

З культур сеюць турнэпс, віку з аўсом, моркву. У гэтым годзе мяркуецца [illegible] турнэпс і дзес. пад бульбу засеена 8 дзес., канюшыну—10 дзес. і віку—9 дзес.

Насеньня, за выключэньнем турнэпсу і буракоў, якое бралі ў крэдытным т-ве, хапіла.

Пры камуне маецца 4 дзес. саду, вадзяны млын, які ў гэтым годзе рамантуецца, а сад агараджваецца і прыводзіцца ў належны парадак. Апроч гэтага, у гэтым годзе на 4 дзес. балота будуць праведзены мэліярацыйныя работы. На ўсё гэта неабходна каля 4 тыс. руб. Частка грошай ужо атрымана.

Побач з вялікімі дасягненьнямі камуна мае і недахваты.

ЖЫВЁЛАВОДЗТВА ПАСТАЎЛЕНА КЕПСКА.

Камуна хоць і лічыцца паказальнай, але у справе жывёлаводзтва адстае. З 22 кароў толькі 3 палешчанай-породы. Хлеў, дзе стаіць скаціна, цёмны, замест вокан —дзіркі, кармушак няма, корм валяецца пад нагамі. Само памяшканьне апусьцілася.

За працу, за палепшаньне гаспадаркі камунары бяруцца. Усе працаю і падняцьцем гаспадаркі на вышэйшы ўзровень зацікаўлены.

У гэтым годзе камуна мяркуе пабудаваць дацкія кармушкі, направіць стрэхі на жылых памяшканьнях, адрамантаваць хлявы, гумны, перавесьці сьвіней у другі, больш лепшы хлеў.

КАЛЕКТЫЎ ГАНДЛЯРОЎ.

Зусім іншая справа з яўрэйскім калектывам імя Прышчэпава, які арганізаваўся ў 1925 г. Калектыў пры добрым арганізатары можна паставіць на належную вышыню. Але мы пакуль што гэтага ня бачым.

Калектыў складаецца з 5 сямей, мае 160 дзесяцін, з іх 70 дзес. ворнай зямлі, 5 коняй, 8 кароў. Паміж членамі калектыву няма ніякае спайкі, да гаспадаркі яны ня прывыклі, зямлю апрацоўваюць наёмныя. Самі члены калектыву большай часткай займаюцца гандлем.

В. Туравец.

Плешчаніцы, Менскай акругі.

Беднота арганізавала арцель.

Сяляне перадавікі актывістыя в. Застарыньня, Чарэйскага р., разьбіраючы і абгаварваючы дырэктывы XУ партзьезду, застанавіліся на пытаньні калектывізацыі. Добра абмеркаваўшы плян дзеяньня на пераабсталяваньню свае вёскі па новы культурна-калектыўны лад і пераходу на вышэйшыя формы зямлякарыстаньня—зараз жа ўзяліся вярбаваць бяднейшых сялян для гаспадаркі калектыўнай.

У калектыўную гаспадарку далі згоду ўступіць 10 гаспадароў.

Зараз ужо справа афармляецца ў АкрЗА. Некалькі дзён таму назад выяжджаў на месца прадстаўнік АкрЗА для дасьледаваньня і знаёмства з справай арганізацыі. На сходзе ў прысутнасьці прадстаўніка сяляне яшчэ раз пацьвердзілі сваю згоду жыць калектыўна і тут-жа прынялі статут сельска-гаспадарч. арцелі. Арцель назвалі «Ясная Паляна».

С. І.

Аршанская акр.

За буйныя с.-г. калектывы.

Эфэктыўнасьць і ўстойлівасьць калектыўных гаспадарак у асноўным залежыць ад разьмераў зямельнай плошчы калектыўных гаспадарак і ад колькасьці двароў, якія яна яднае. Калі гаспадарка [illegible] зусім нельга ставіць пытаньне аб маш[illegible] і інтэнсфікацыі яе.

На Беларусі сярэдняя забясьпечанасьць калектыўных гаспадарак зямлёў раўняецца 75,2 гэкт., а ў некаторых акругах гэтая лічба паніжаецца да 50-60 гэкт. на 1 аб'яднаньне (гэтыя лічбы належаць да сеткі калектыўных гаспадарак, якія арганізаваліся да 1 кастрычніка 1927 г.). Калектывы-ж, арганізаваныя нанова, па сваёй зямельнай плошчы і складу насельніцтва зьяўляюцца яшчэ больш дробнымі. Асноўная маса нанова арганізаваных калектыўных гаспадарак па Беларусі аб'яднае 5-7 двароў з колькасьцю ўсіх зямельных угодьдзяў—45-50 гэктар. Ці могуць гэткія маленькія калектыўныя гаспадаркі выкарыстаць перавагі буйнай гаспадаркі? Ці можна разьлічваць на ўстойлівасьць гэткіх калектыўных гаспадарак, якія аб'ядноўваюць 5 двароў? Трэба толькі аднаму, двум дварам выйсьці з калектыўнай гаспадаркі, а ад гэтага мы не гарантаваны, як калектыўная гаспадарка юрыдычна і фактычна спыніць сваё існаваньне. Зараз маецца цэлы шэраг выпадкаў, калі гэткія дробненькія гаспадаркі, пасьля 2-3 месяцаў існаваньня—раскідаюцца.

Гэткія маленькія гаспадаркі ў асноўным маюць спажывецкі характар і разьвіцьцё іх таварнасьці не заўсёды магчыма.

Вось чаму мы лічым, што пры арганізацыі калектыўных гаспадарак [illegible] нормы заснавальнікаў трэба павялічыць да 10. Пытаньне, высунутае ў праекце рэзалюцыі ўсесаюзнага зьезду, калектыўных гаспадарак, аб павялічэньні нормы заснавацеляў, лічым зусім своечасовым, якое павінна быць замацавана статутным парадкам. Павялічэньне нормы заснавальнікаў, па нашай думцы, не затрымае росту калектыўных гаспадарак. У зьвязку з існуючай мінімальнай нормай заснавальнікаў у ліку 5 чал., шмат хто з працаўнікоў пры арганізацыі калектыўных гаспадарак не пярэчылі гэтаму і ў выніку большасьць арганізаваных калектыўных гаспадарак складзены з 5 членаў. З практыкі працы па калект. гаспадарках можна адзначыць, што арганізаваць калгаспадарку з 10 членаў, зразумела, больш цяжка, чым з 5-ці, і калі пры вырашэньні пытаньня, магчыма, у некаторых выключных выпадках колькасьць гэткіх гаспадарак будзе нязначная, дык за тое якасьць іх будзе лепшая. Устойлівасьць і жыцьцёвасьць гэткіх калгаспадарак будзе забясьпечана.

Аграномы: **Цынкоў, Пліс.**

З ЯВАРОЎШЧЫНЫ.

Яшчэ не заціхлі гутаркі аб выкрыцьцях п. Бэлцікоўскай адносна службы некаторых пэпэсаўцаў у дэфэнзыве, як у апошнім нумары месячніка «Жыцё Вольнэ» выступіў з цяжкімі абвінавачаньнямі проці ППС не як праціўнік, а прыяцель, сацыялісты Рамуальд Мінкевіч, і ставіць вельмі сур'ёзныя закіды ЦВК ППС. У артыкуле пад назвай: «Час расьцяць валдыр Яваро́ўшчыны» ён піша:

Дзесяцігадовае непадзельнае кіраваньне Яваро́ўшчыны *) ў работніцкай Варшаве давялі Польскую Сацыялістычную Партыю да ўтраты 2/3 сваіх палітычных уплываў, а работніцкія масы—да неахвоты брацьдзеяльнасьці ў сацыялістычным руху.

Не можна голаснага выказаць якое-небудзь сумляваньне ў карысьнасьці ўсялякіх загадаў Яваро́ўшчыны. У такім выпадку ты зьяўляешся відавочным бальшавіком, якога загадваюць сьцерагчыся, як заразы. За крытыку п'яноства, якое мае месца ў памяшканьні АК ППС пад асабістай пратэкцыяй Яваро́ўскага, забараняецца ўступаць у партыйныя памяшканьні і нават без суду пазбаўляюцца пасад.

Балота зацягвае патроху і шмат каго з старэйшых сяброў арганізацыі, работнікаў і інтэлігентаў... Не адзін калісьці шляхетнейшы па натуры таварыш пянэр учыняе часам паступкі з этычнага боку вельмі падазроныя, а з сацыялістычнага—проста недапушчальныя. Прагульваюцца грошы, прызначаныя на асьвету і культуру...

СТРАШНЫЯ ВЫНІКІ—КАЖА, УРЭШЦЕ, МІНКЕВІЧ—ДАЎ НА... ПЕРШАМАЙСКІ ПАГРОМ І ПАРАНЕНЬНЕ НЕКАЛЬКІХ СОТ РАБОТНІКАЎ, ПЕРАВАЖНА [illegible] ПРОЦ.) ПРАЗ АКРУГОВУЮ ПАЛІЦЫЮ ППС. ГЭТА ФАКТ. ГОЛЫ. ТРАГІЧНЫ".

п. Мінкевіч кажа далей, што ніякімі мітынгоўскімі антыбальшавіцкімі выступленьнямі, ніякімі фальшывымі рэзалюцыямі, ніякімі «камітэтамі дапамогі для параненых пэпэсаўцаў»—з прычыны адсутнасьці параненых пэпэсаўцаў—ня можа прыкрыць агіднай сутнасьці пэпэсаўскіх падзей. «Каго гэтым хацелі ашукаць? — пытаецца п. Р. Мінкевіч.

На гэта выступленьне п. Мінкевіча адказаў пэпэсаўскі «Роботнік», але яго адказ ня зьбівае па сутнасьці закідаў, сфармуляваных п. Мінкевічам. «Роботнік» кажа толькі, што ні ЦВК і ні хто з партыі ППС ніколі не ставіў п. Яваро́ўскаму якіх-небудзь закідаў, і што адносіны п. Яваро́ўскага да работніцкага руху былі заўсёды ідэёвымі і бязінтэрасоўнымі.

Аб маёвых выпадках—ані слова, аб «палітыцы» п. Я. таксама.

Так ЦВК і «начальна рада» ППС разам з іх газэтай «Роботнікам» імкнуцца затушаваць, замаўчаць і наогул схаваць ад людзкога вока тое, што ўжо вылезла наверх і ад чаго ППС'ам усё роўна ня ўдасца схавацца.

*) Яваро́ўскі—лідэр варшаўскіх пэпэсаўцаў.

ВОГНІШЧА БАРАЦЬБЫ.

(Эскіз).

Есьць на зямной кулі невялічкі лапік тэрыторыі, вядомы шырокаму сьвету жудаснай пагудкай. А пагудка гэтая ўзрасла пад грунтовым крылом панскай акупацыі, якая душыць той лапік тэрыторыі чорнай ночай. Пагудка гэтая ўзрасла без праменьняў жыцьцядаўчага сонейка, радзілася з мук, крыўд і паняверы мільённых мас,—пагудка гэтая жудасная, як сусьветная вайна, гібельна як земляздрыг у Японіі.

І лунае яна не паўстрыманая, галасістая ад краю да краю, супыняецца на гнёздах працы і машын—фабрыках, супыняецца паміж ніў каласістых, гэтых гаварлівых жалабшчыкаў, паміж пушч—пяюньняў песень бунтарскіх, супыняецца там, дзе вялікая армія працы мае жыцьцё каля вогнішча барацьбы.

Чуюць баяны і змагары сусьветнай арміі працы, чуюць, дазнаюць ад пагудкі, што як жыў-быў чалавек, як сьвет-сьветам існуе, дык ня было такой краіны, як Заходняя Беларусь, так зьвільжанай і прасякнутай чалавечай крывёй, потам і сьлязьмі. Нідзе ня чувана, ня гадана, каб зьдзекаўся дзікі зьвер над сваёй пажывай так, як зьдзекуецца панскі акупант над целам паняволенага мужычага народу. Сканана трымаецца ён учарэпіўшыся кіпцюрамі, упіўшыся зубамі ў сваю ахвяру і прагавіта лыпае вачмі на ўсход, каб яшчэ як урвануць кавалак цела жывога народу.

Нідзе няма такога крывавага летапісу, такога ўсенароднага стогну зьвяканьня кайданаў і посьвісту нагайкі, як на Заходняй Беларусі. Нідзе няма такіх атручаных і жорсткіх лічбаў, такога фізычнага зьніштажэньня краю і народу.

Заходняя Беларусь—край найбольш пацярпеўшы ад імпэрыялістычнай сусьветнай бойні. Зьвыш 1900000 чалавек ці каля 2/5 усяго насельніцтва вырвала вайна міжнародных крывасмокаў. Да 50-60 проц. не далічыў сваёй маемасьці край саломы, дрэва і балот. Да 550000 будынін зруйнавана. Палі паранены акопамі, вырублены сады, лясы чарнеюць галавешкамі, альбо тапурацца карчамі. На кожны квадратны кілёмэтр вайна выгрызла 18 чалавек...

10 гадоў муліць ярмо крывавай акупацыі, 10 гадоў грабіць край рука пана-жывадзёра.

А колькі-ж разоў брызнула кроў з пад пят паноў-акупантаў!

Паходы агнём і мячом уздоўж і поперак краіны.

Крывавая парука і карацельныя экспэдыцыі 1924-25 г. г., а іх сьлады—пажарышчы, руіны, мора сьлёз і крыві.

Стара-Бярозаўскі пагром.

Косаўскі расстрэл рабоча-сялянскай дэманстрацыі.

Да 800 ахвяр даразных судоў.

Закатаваны ў дэфэнзыве камуніст—рабочы Райхман і шмат іншых нявядамых, негаданых.

Звыш 3.000 выдатнейшых барацьбітоў—мозг і кроў народу, кінуты акайданеныя ў каменныя мяшкі, у дамавіны для жывых фашыстаўскай Польшчы, гэтай турмы народаў, гэтага ката рабочых і сялян.

Разгром 100.000-най Рабоча-Сялянскай Грамады.

Нябывалыя масавыя працэсы.

Гістарычныя 209 гадоў катаржнага прысуду.

Штодзённы паўсямесны бязупынны сацыяльны, нацыянальны, культурны і палітычны зьдзек і паняволеньне, дзікая эксплёатацыя праз сваіх, акупанцкіх і міжнародных жывадзёраў, дармаедаў і іх паслугачоў.

Ня раны, ня язвы дымяцца крывёй па гарадох, мястэчках і вёсках—гэта турмы, дэфэнзыва і паліцэйскія закамаркі асеядлаць сваю маюць. Там найтанчэйшымі сярэднявеччыма катаваньнямі выматваюць душу, калечаць цела рабочым і сялянам.

Тут вастрог—школа.
Хлеб у вастрозе.
Зямля ў магіле.
Жыцьцё, бы катарга.
Воля ў сьмерці.

Ой, не дапушчаюць паны цёмную мужычую Заходнюю Беларусь да школы, каб ня ведала яна, дзе мора-акіян і колькі краін за ім, каб не разьнесла туды іхнія крывавыя дзеі-падзеі. Часамі беспрацоўныя, або як навабранец, пападае Заходняя Беларусь на Пазнаншчыну ці Конгрэсоўку, ня далей. Але пад чорным крылом акупацыі ўзрасла пагудка—не паўстрымаць, не акарнаць паном пагудкі. Водзіць яна лапатную Заходнюю Беларусь па шырокім сьвеце, водзіць па асфальтавых вуліцах Бэрліну, па жалеза-бэтонным Нью-Ёрку, па крывавых разорах абстралянага Кітаю, водзіць да блізкай сваячніцы—далёкай Індыі, да змагаркі Афрыкі з гарачым дыханьнем, аднак найчасьцей Заходняя Беларусь наведвае кузьню жыцьця, штаб арміі працоўных—СССР.

Але лапатная Заходняя Беларусь знае шлях да свайго вызваленьня, ой, добра знае шлях! Ідзе яна ў вагромністай грамадзе па бушуючых прасторах і другога ў грузалкі, у трэскі ўсе перашкоды і запоры. Нічым гэтага жалезнага паходу ня спыніць.

Усюды, дзе праходзіць Заходняя Беларусь, яе вітаюць фабрыкі, аквечаныя ў чырвань сьцягаў, а вёскі высьцілаюць шлях дываванамі—нівамі, частуюць пушаным караваем і бунтарскімі песьнямі.

Усюды разнагалосыя, разнакалёрныя вітальнікі—рабочыя ў знак разуменьня, спагады і самаахвярнасьці ўзьнімаюць на мазольных далонях, бы сьветачы свае сэрцы, пылаючыя жарам нянавісьці, узварушаныя гатоўнасьцяй да бою, да расправы.

Бо ўсякі, у каго нутро гартавана ў агні працы і змаганьня, хто бача паняволенай душой, а чуе параненых сэрцам, той адгукнецца агнящветамі барацьбы, напружыць сілай мускулы, разгоніць думкі лёзунгамі.

Шумяць, хвалююцца чырвоныя сьцягі ў сталёвых руках сусьветнага пралетарыяту, а грудзі дыхаюць прывітаньнем, поклічам і гімнамі.

Вось горадзенскія рабочыя хімікі ў няроўным баі 7-мясячнай забастоўкай намагаюцца палажыць капіталіста на абедзьві лапаткі.

Вось селянін на падпісным лісьце падпісваецца сваёй крывёй за вызваленьне палітзьняволеных, проціў фашысцкай дыктатуры. Ведае, што гэты подпіс грозіць няміласьцяй і помстай. Аднак рука яго ня дрыжыць.

Вось вясковая кабеціна ўтуліла любоўна, прыціснула да грудзей ня крыжык і не мэдалік; а сваё наймілае, найдарагое, у чым усе надзеі і ратунак. Кінула-рынула хатнія справы, перанесла праз колькі дзясяткаў вёрст праз агонь, ваду і непагоду, праз ксяндзоўскае пекла, катаваньні дэфэнзывы і паліцыі, праз вобыскі, пагромы, подкупы, стрэлы і нагайкі, перанесла сваё наймілае, найдарагое—выбарны номер за тых, хто імкнецца яе вызваліць; прынесла сваю нянавісьць да акупантаў, каб уліць яе атрутай у ўрну панскага шчасьця.

Вось дзеці рабочых і сялян, дзеці гэрояў, дзеці барацьбіты з чырвонымі сьцягамі, рэвалюцыйнымі песьнямі ідуць больш сотні наперадзе дэ

Жыцьцё і праца асьветніка.

Бліжэй да масавай працы.

На старонках „Савецкай Беларусі“ ня раз адзначалася, што «С. Б.» далёка не ў выстарчальнай колькасьці выпісваецца асьветнікамі. І праўда. Не згадзіцца з відавочнымі факталі нельга. І ня толькі ня ўсе настаўнікі выпісваюць „С. Б.“, але нават, што яшчэ горш, і ня ўсе чытаюць газэту. Разумеецца, тут віна і асьветнікаў, і мясцкомаў і, можа быць, і самой рэдакцыі, а галоўным чынам НКА і ЦП працасьветы.

Я дазволю сабе прывесьці думку некаторай часткі асьветнікаў (думаю, больш актыўнай) аб недахопах нашай «Старонкі Асьветніка». Усё добрае ведае і сама рэдакцыя, а аб недахопах трэба сказаць некалькі слоў. А можа з гэтага і карысьць якая-небудзь будзе.

Вясковы і гарадзкі настаўнік у сваёй штодзённай працы хоча і павінен ведаць ня толькі агульны напрамак працы ў школе, спрод насельніцтва, па саюзнай галіне і г. д., але ён яшчэ хоча быць у курсе спраў сёньняшняга і заўтрашняга дню, ён хоча ня толькі чытаць ды расьпісвацца на адносінах мясцкому ці інспэктара, але і бачыць, наколькі ўвязваецца праца на месцы з пастаўленымі практычнымі праблемамі Цэнтральнага Праўленьня саюзу ці НКА.

Вось мы, напрыклад, ведаем што робіцца ў Маскве (на саюзнай галіне і на лініі НКА), але што робіцца ў Менску—мы гэтага ня ведаем. Ня ведаем мы што робіць, які напрамак у розных галінах працы ЦП саюзу Прац. Асьветы, ня ведаем нічога аб праграмнай працы, аб працы па складаньню і выданьню падручнікаў і г. д. У «Учит. Газете» гэтым пытаньням адводзіцца належнае месца, яны прагледаюцца асьветнікамі, яны даюць нам напрамак у нашай штодзённай працы. А пэўна-ж, па Беларусі маюцца свае асаблівасьці. Чаму-б разы два ў месяц не паведамляць працаўнікоў асьветы аб працы культадзелу ЦП, аб тарыфна-эканамічнай працы і г. д.? Чаму-б не надзяліцца з асьветнікамі сваёй працай Навукова-Мэтадычны Камітэт?

Так-жа інчай выклікаць у масавага працаўніка ініцыятыву, зьвязацца належнымі ніцямі цэнтру з пэрыферыяй? Няўжо-ж мы і ў далейшым будзем чакаць толькі (ужо абрыдла) абежнікаў на мясцох, якія заўсёды позьняцца?

Вось, напрыклад, шмат пісалі аб адсутнасьці кіраўніцтва на мясцох. А ці адказаў хто-небудзь на цэлы шэраг недахопаў у нашай працы? А пісаць толькі дзеля таго, каб напісаць, ня ўсякі хоча.

Вось канчаецца хаця-б вучэбны год. Колькі напрыемнасьцяй прыносіць гэты канец і для вучняў і для настаўнікаў, колькі непаразуменьняў... А чаму-б не правесьці агляд ці падлік працы ў гэтым напрамку.

Шмат хто ламае галаву над пытаньнем аб сувязі школы з вучнямі ў летні час. А чаму-б не высьветліць гэта пытаньне на „Старонцы Асьветніка“? А далей ідуць пытаньні грамадзка-карыснай працы, піянэр-рух і школа і г. д.

Праводзіцца абгаварэньне сыстэмы народнае асьветы. А хто аб гэтым што ведае? А тое, што пішацца ў цэнтры—далёка яшчэ ня тое, што гаворыць у гушчах. А як праводзіцца розныя кампаніі? Гэта пытаньне на «Старонцы Асьветніка» таксама высьвятляецца нездавальняюча.

Наогул-жа неабходна, каб «Старонка Асьветніка» адбівала працу ў цэнтры, давала кірунак працы масавага настаўніцтва, жывей рэагавала на пытаньні, якія падніімаюцца з месц і дабівалася высьвятленьня спрачных месц і недахопаў у працы як цэнтральных устаноў, так і масавых нізавых працаўнікоў.

Асьветнік.

АД РЭДАКЦЫІ: Рэдакцыя з свайго боку рабіла і робіць усё магчымае для палепшаньня асьветніцкага аддзелу, але, на вялікі жаль, ЦП працасьветы і асабліва НКА чамусьці застаюцца глухімі да гэтага пытаньня. Пакуль што з іх боку амаль ніякай дапамогі ня было.

Магчыма яны цалкам захапіліся часопісам «Асьвета», але ня трэба забываць, што «Асьвета» чытаецца меншым колам асьветнікаў, чым газэта, і апроч таго яна выдаецца рэдка, нават ня кожны месяц.

У далейшым рэдакцыя спадзяецца, што ЦП Працасьветы і НКА, урэшце, раскачаюцца і прымуць актыўны ўдзел ва ўсебаковым асьвятленьні асьветніцкага жыцьця праз нашу газэту.

За рацыянальны адпачынак асьветніка.

Хутко пабіжыцца час, калі ўпартая, цяжкая, але цікавая і карысная праца настаўніка будзе спынена на досыць працягны тэрмін.

Ня гледзячы на цяжар умоў працы, на тое, што ж у канцы году выбухае ў некалькі разоў больш чым было на працягу году, ня гледзячы на тое, што здароўе настаўніка пагоршылася, усё-ж кожны настаўнік перакананы ў тым, што ім зроблена ўсё магчымае, што ён даў усё, што вымагалася ад яго праграмаю і жыцьцём. Адным словам, настаўнік--іканінік.

Але дзе і як будзе настаўнік, скончыўшы сваю працу, адпачываць,—вось гэта справа іншая, аб гэтым клапоціцца настаўнік, аб гэтым патрэбна паклапаціцца органам Наркамасьветы і саюзу працасьветы.

Мне здаецца, што перш за ўсё настаўніцтву абавязкова патрэбна даць магчымасьць як калектыўна, так і індывідуальна, у часе летніх вакацый паглядзець, калі ня ўсе, то некаторыя культурныя асяродкі нашага Саюзу Рэспублік, праз што настаўнік папоўніць свае веды, якія карысна будуць перададзены вучням.

Поруч з гэтым настаўнік праверыцца, адпачне ў новых умовах жыцьця.

Настаўніцтва, здароўе якога патрабуе і вымагае рамонту, бязгрошна, павінна быць накіравана з дапамогаю Наркамасьветы і працасьветы ў дамы адпачынку і санаторыі, бо ад гэтага залежыць якасьць асьветніцкае вытворчасьці, таму што хворы настаўнік будзе і «хворым» працаўніком у школе, а гэта ня можа не адбіцца на станоўцы працы ў школе ў той час, калі на якасьць не мы зварачваем асаблівую ўвагу.

Ня гледзячы на тое, што асьветнікаў наогул надзвычайна вялікая армія і што ад гэтага дзяржава можа панесьці некаторыя выдаткі, Наркамасьветы, разам з саюзам працасьветы, патрэбна дабіцца, каб даць магчымасьць настаўніку хаця-б са скідкаю, якая даецца студ. рабфаку, паехаць у экскурсію, на курорт, у дом адпачынку, памятаючы, што гэтыя выдаткі будуць апраўданы са значным процантам, бо калі карысна рабочаму, або служачаму знаёмства з нашымі дасягненьнямі ў сэнсе культурнага і эканамічнага будаўніцтва, то дзеля настаўніка гэта неабходна.

І. Масюкевіч.

ПРАФПРАЦУ Ў ЛЕТНІ ЧАС НЕАБХОДНА ЎЗМАЦНІЦЬ.

Шосты пленум ЦП саюзу Белпрацасьветы, які адбыўся 19-20 мая, абгаварыў шэраг надзвычайна важных пытаньняў далейшай саюзнай працы.

Налыходзячы летні пэрыяд часу ставіць перад саюзам спэцыфічныя пытаньні працы для іх ажыцьцяўленьня. Першая асноўная задача, ад выраішэньня якой залежыць посьпех усе саюзнай працы, заключаецца ў тым, каб перамагчы вельмі шкадлівую традыцыю, што лета выяўляецца запішам у саюзнай працы. Погляд такі зусім няправільны і з ім трэба весьці барацьбу. Наадварот, летні пэрыяд часу патрабуе разгортваньня новых вучасткаў саюзнае працы.

Спэцыфічнымі пытаньнямі летняй саюзнай працы зьяўляюцца два пытаньні: удзел саюзных органаў у складаньні каштарысаў і вытворчых плянаў на наступны 1928-29 бюджэтны год і летняя культпраца. Пленумам ЦП асаблівая ўвага была ўдзелена гэтым пытаньням.

Дэцэнтралізацыя працы па складаньню каштарысаў на наступны бюджэтны год, канчатковае зацьверджаньне каштарысаў у акруговых цэнтрах вымагаюць ад саюзных органаў надзвычайнай увагі гэтай справе. Усе цяжкасьці працы, якія раней ускладаліся на плечы ЦП, цяпер пераносяцца на плечы прафорганаў РМК і Акруговых праўленьні. Ад пасьпяховасьці гэтай працы залежыць тое ці іншае становішча справы народнае асьветы і ўмоў працы самых асьветнікаў.

Пленум у сваёй пастанове па пытаньню аб удзеле саюзных органаў у складаньні каштарысаў ухваліў шэраг мерапрыёмстваў. Па-першае, Пленум разглядзеў праэкт штатаў культасьветных устаноў на наступны год, унёс некаторыя зьмены, асабліва ў штаты дзіцячых устаноў і даручыў прэзыдыуму ўнесьці гэты праэкт у ваканадаўчыя ўстановы для канчатковага зацьверджаньня.

Пленум прызнаў таксама неабходным паставіць пытаньне перад належнымі органамі аб упарадкаваньні справы аплаты за адміністрацыйную працу ў культ-асьветных установах. Да гэтага часу ў справе аплаты за адміністрацыйную працу было вельмі шмат недарэчнасьцяў.

Акрамя дробных пытаньняў, якія знайшлі адбітак у пастановах пленума, як напрыклад,—водпуск сродкаў на кватэры для асьветнікаў, забясьпечаньне працоўных норм, Пленум прызнаў таксама неабходным дабіцца агульнага падвышэньня пэнсіі асьветнікам на наступны бюджэтны год.

Ня менш значная ўвага Пленумам была зьвернута на пастаноўку летняй культпрацы. Пленум даў дырэктыву ўсім прафорганам ні ў якім разе не дапушчаць зьніжэньня тэмпу культпрацы ў летні пэрыяд і разгарнуць новыя вучасткі яе.

Галоўная ўвага саюзных органаў у летні пэрыяд павінна быць зьвернута на разгортваньне фізкультуры сярод саюзных мас, экскурсій, арганізацыі справы турызму і ваенізацыі членаў саюзу. На гэтых пытаньнях распрацавана шэраг практычных мерапрыёмстваў.

Адначасна Пленум асабліва падкрэсьліў скарыстаньне летняга пэрыяду для рэалізацыі пастаноў ранейшага пленума ЦП аб грамадзка-палітычным выхаваньні асьветніка.

Пастаноўка на вясеньня-васеньніх асьветніцкіх канфэрэнцыях-курсах шэрагу дакладаў аб палітычна-гаспадарчым становішчы краіны і задачах партыі на вёсны, уключэньне ў праграмы настаўніцкіх курсаў цыклю лекцый на антырэлігійныя тэмы, загастраньне ўвагі асьветніцкіх мас на справе барацьбы з рэлігійнасьцю, разгортваньне палітыка-выхаваўчай працы сярод асьветніцкіх мас, шляхам арганізацыі гутарак па сучасных палітычна-гаспадарчых пытаньнях, антырэлігійных, саюзных і інш., прапяг распрадоўкі ў гуртках незаконнага зімовага матар'ялу—вось тыя мерапрыёмствы, якія вызначаны пленумам.

Поруч з гэтым пленум даў дырэктыву ўсім прафорганам не паслабляць увагі справе самаадукацыі, дапамагаць індывідуалам, якія займаюцца самаадукацыяй, кансультацыяй, літаратураю і г. д. У летні пэрыяд мяркуецца адчыніць шэраг курсаў па перападрыхтоўцы настаўніцтва ў акруговых гарадох. Гэту масу курсантаў саюзныя органы павінны ўсямерна абслужыць як у адносінах культурна-мастацкага, так і ўцягненьня іх у агульна-саюзнае жыцьцё.

Пленум падсёў вынікі працы калдагаворнай кампаніі за зімовы пэрыяд, заслухаў справаздачу Полапкага акр. праўленьня саюзу і даў полы шэраг дырэктыў для палепшаньня саюзнай працы.

У канцы пленум ямчэ раз падкрэсьліў неабходным напырыць падпіску на газэту «Савецкая Беларусь», разгарнуць кампанію на распаўсюджаньню газэты сярод асьветнікаў, асабліва ў пачатку навучальнага году.

На гэтым пленум ЦП скончыў сваю працу.

Я. Мацюкевіч.

Гніе матар'ял для школ.

Згодна пляну ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня сёлета ў Халопенічах павінна будавацца 4-хкамплектная школа і ў вёсцы Дуброўцы, Халапеніцкага райёну— плянавая 2-хкамплектная школа.

Усім нам яшчэ добра памятна, як пару гадоў таму назад амаль што дашчэнту выгарэла ўсё мястэчка Халопенічы. Зразумела, што ў памяшканьнях, як халопеніцкая сямёхгодка, так і яўрэйская пачатковая школа, адчуваюць вельмі вострую патрэбу.

Вось чаму насельніцтва з вялікай ахвотай узялося ўзімку вывозіць лесаматар'ял для школы. Мы ведаем якая вялікая праца патрэбна для таго, каб вывезьці лес для 2-хкамплектнай школы, а таму стане зразумелым колькі працы паложана сельсаветам на тое, каб вывезьці ўвесь лесаматар'ял для такой вялікай школы, як чатырохкамплектная.

Насельніцтва ня толькі вывезла поўнасьцю ўвесь матар'ял, але ўжо з месяц таму назад ім-жа была падвезена на месца пабудовы патрэбная колькасьць каменьняў.

Райвыканком ужо даўно знайшоў падрадчыка, які па дагавору ўзяўся будаваць школу, але больш месяцу матар'ял ляжыць, а само будаўніцтва ўсё яшчэ не распачалося.

Вы думаеце, што на пабудову школ няма ў бюджэце сродкаў?

Не. На пабудову 2-х школ у Халопеніцкім райёне ў бюджэце адпушчана звыш 19.000 руб.

Райвыканком ня раз ужо зварочваўся ў Менскі Акрвыканком аб водпуску грошай на пабудову школ, але нашы акрвыканкомаўцы адказваюць, што грошай у іх няма. Мы таксама добра ведаем, што наша будаўніцтва адчувае недахоп у жалезе для даху і вось райвыканком, як добры гаспадар, своечасова набывае ў мясцовым сельска-гаспадарчым крэдытным таварыстве ў крэдыт жалеза для даху школы, а акрвыканком упарта адказвае, што грошай няма. Што рабіць далей, дык і самі ня ведаем,—скардзяцца мясцовыя працаўнікі.

Ня лепш становішча і з вясковай школай у в. Дуброўцы. Там таксама ўжо з месяц поўнасьцю ляжыць увесь матар'ял, а будаваць няма за што.

Насельніцтва пачынае пагаварваць аб тым, што даремна час і сваю працу марнавалі. Бажуць, што добры гаспадар ужо фундамант бы вывеў і пачаў сьцены рабіць, а ў нас усё валяецца бяз толку.

Сялянства кажа праўду, бо калі Менскі Акрвыканком зацьвердзіў плян школьнага будаўніцтва і нават адпусьціў своечасова лес, дык ён павінен быў падумаць і аб своечасовым водпуску сродкаў па будаўніцтва.

Нам ужо досыць добра вядома гаспадарнасьць Менскага Акрвыканкому ў справе будаўніцтва Цэнтральнай Малочнай, але навошта-ж гэту «гаспадарнасьць» распаўсюджваць яшчэ на вёску.

Урэшце-ж, дакуль нашы гаспадарнікі і адміністратары будуць безадказнымі за ўсё тое галавацяпства ў будаўніцтве, якое мы назіраем навокал.

В.

Вынікі санітарна-выхаваўчай працы ў школе.

Шмат ёсьць школ, якія слаба зварочвалі ўвагу на санітарна-гігіенічны бок вучняў. Гэта віна цалкам павінна легчы на настаўнікаў, якія не зразумелі, як практычна павінна пераламляцца культурная рэвалюцыя ў школе і на вёсцы. Санітарна-гігіенічны бок працы—гэта ёсьць частка агульнага выхаваньня вучня, праз якіх мы павінны выхоўваць масу вясковай моладзі, а пагэтаму кожны настаўнік, калі зварочваў увагу на гэта, ён практычна на месцы рабіў культурную рэвалюцыю.

У гэтым напрамку па сваёй школе я маю дасягненьні. Можа гэта было і дробязьзю, калі іншы раз я гаварыў вучням: «прыпыні гузік, зашыў сарочку, чаму не закруціў добра вёдру калі нагі» і г. д., але ў канцы году я гэтага ўжо не казаў, бо дзеці прыкліі да акуратнасьці і кожны сам сачыў за сабой. Гэтак і прывучыў дзяцей адносіцца акуратна ня толькі да сваіх рэчаў, а і да ўсіх школьных. Гэтыя санітарна-гігіенічныя звычаі дзеці практычна самі праводзяць і дома. Ужо вучань ня кіне дома шапку на лаўку або куды папала, ці, набраўшы грязі на ногі, стане сярод хаты, ды і ну абтрасаць, а ўсё гэта будзе зроблена на сваім месцы.

Праўда, гэтаму дапамагло закладаньне паказальных хат у сэнсе санітарыі ў вучняў, якія часта даведваліся ўсёю групаю.

Такім чынам, усё ўзягае ў канцы году дало добрыя вынікі. Застаецца толькі не паслаблядь працу ў летні час, тады мы дабіёмся праз школу яшчэ большага.

Настаўнік.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР.

24-га мая 1928 году пад старшынствам тав. А. Г. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦВК. Разгледжан шэраг пытаньняў:

АБ САВЕЦКІХ І КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРКАХ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад Наркамземляробства аб выніках правядзеньня ў жыцьцё пастаноў ЦВК і СНК СССР ад 16-III 27 г. аб савецкіх і калектыўных гаспадарках.

Пастановы Саюзнага ўраду ад 16-III 27 г. прадугледжваюць цэлы шэраг важных мерапрыёмстваў па палепшаньні і ўзмацненьні савецкіх і калектыўных гаспадарак. Гэтыя пастановы ў асноўным у межах БССР ужо ажыцьцёўлены і далі добрыя вынікі.

Агульнае становішча савецкіх і калектыўных гаспадарак у кароткіх рысах наступнае:

Савецкія гаспадаркі.

Удзельная вага савецкіх гаспадарак у сельскай гаспадарцы яшчэ малазначная, але ўсё-ж узмацненьне савгаспадарак за апошнія часы садзейнічае росту іх уплыву на масу дробных сялянскіх гаспадарак у справе пераарганізацыі апошніх у сацыялістычным напрамку. Лік савецкіх гаспадарак на 1-І 28 г. складае 156 з агульнай у іх плошчай у 86541 гэктар усіх угодзьдзяў.

Забясьпечанасьць савгасаў цягавай сілай і буйнай рагатай жывёлай наступная: цягавая сіла ў конскай—3568 адзінак (у тым ліку 50 трактараў Фордзон); узрослая буйная жывёла—5633 галавы, маладняк—2681 галава. У частцы ўкамплектаваньня цягавай сілай савгасы дасягнулі амаль што поўнай нагрузкі; у адносінах буйнай жывёлы яны дайшлі толькі да 38,1 проц. патрэбнай нормы. Значэньне савгаспадарак як індустрыяльнай базы па пераапрацоўцы прадуктаў сельскае гаспадаркі, паступова ўзрастае. Расьце лік занятых рабочых; усіх рабочых у пераводзе на гадавых у 1926 г. было 6264 чал., на 1928 год—7604 ч. Зарплата рабочым за гэтыя 2 гады ўзрасла на 14,6 проц. Разьмеры капітальных укладаньняў у савгасы ўвесь час узрастаюць і ідуць наступным чынам:

1924 г.	1925 г.	1926 г.	1927 г.
368485 р.	722517 р.	1093047 р.	1671628 р.

Калектыўныя гаспадаркі.

На 1 кастрычніка 1927 г. ўсіх калектываў было 416; за пэрыяд часу з 1919 году калектываў было арганізавана значна больш, але 10-12 проц. усіх калектываў па розных прычынах штогодна распадалася. Усяго насельніцтва ў калгаспадарках на 1-X 27 г. складала 21330 едакоў; уся зямельная плошча складае 55100 гэкт. усіх угодзьдзяў. Земляўпарадкаваньне ў калгаспадарках вытварасьцца з 1927 г. за дзяржаўны кошт і ў першую чаргу. З жывога інвэнтару цягавай сілай калгаспадаркі забясьпечаны ўжо блізка да нармальнага. На цягавую адзінку падае каля 10 гэкт. Буйнай рагатай жывёлай калгаспадаркі забясьпечаны толькі напалову нармальнай нормы. Калгасы адчуваюць вялікую патрабу ў мёртвым інвэнтары, у асаблівасьці ў складаных машынах. На падставе пастаноў ураду аб перадачы ў працоўнае карыстаньне дзяржаўнай зямельнай маёмасьці, гэткай перадана ў асноўныя недзялімыя капіталы калгасаў на агульную суму каля 3.046.944 руб., у тым ліку 32 прамысловых прадпрыёмствы. Прымаюцца меры па пырокаму ўцягненьню таварнай часьці калгасаў у каапэрацыйны тавараварот.

Навокал дакладу разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступаўшыя члены Прэзыдыуму ЦВК выказваліся за неабходнасьць дакладнага і поўнага правядзеньня ў жыцьцё ўсіх даручэньняў, якія вынікаюць з пастаноў ураду СССР ад 16-III—27 г. аб савецкіх і калектыўных гаспадарках, а таксама і іншых пастаноў ураду СССР і ўраду БССР па гэтым пытаньні.

У спрэчках па дакладу выказаліся: т. т. Чарвякоў, Каровікаў, Карклін, Бэйлін, Гэльтман, Подзін, Аскерка, Яцкевіч, Хацкевіч.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў даручыць НК РСІ у месячны тэрмін праверыць практычнае выкананьне ўсіх маючыхся пастаноў аб калектыўных і савецкіх гаспадарках.

Пасьля праверкі НК РСІ будзе заслухан на пасяджэньні Прэзыдыуму ЦВК адпаведны даклад НК Земляробства і садаклад НК РСІ.

АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ РАЗЬМЯРКОВАЧНАЙ КАМІСІІ.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад аб дзейнасьці Цэнтральнай Разьмяркавачнай Камісіі.

У спрэчках па дакладу Разьмяркавачнай Камісіі выказаліся: т. т. Сташэўскі, Хацкевіч, Бэйлін, Гохман, Гэльтман, Карклін, Масальскі.

Прэзыдыум ЦВК прызнаў правільнай лінію ў дзейнасьці Цэнтральнай Разьмяркавачнай Камісіі і працу яе здавальняючай. Для распрацоўкі практычных прапаноў па дакладу ўтворана камісія ў складзе т. т. Гэльтмана (старшыня), Сташэўскага, Бэйліна, Віленстовіча і Гохмана.

АБ ВЫКАНАНЬНІ ДЗЯРЖАЎНАГА БЮДЖЭТУ БССР ЗА 1926-27 ГОД.

Прэзыдыум ЦВК заслухаў даклад прадстаўніка ад СНК—памесьніка Народнага Камісару Фінансаў БССР тав. Буніна аб выкананьні дзяржаўнага бюджэту БССР за 1926-27 год.

Прэзыдыум ЦВК канстатаваў зацьвердзіць справаздачу аб выкананьні бюджэту ў наступных сумах:

а) па дзяржаўных даходах, якія паступілі ў касы НКФ БССР, СССР і іншых саюзных рэспублік за рахунак бюджэту БССР, а таксама і касы спэцыяльных зборшчыкаў за час з 1-X 26 г. да 30-IX—27 г. уключна —50.541.262 руб. 09 кап.

б) па дзяржаўных выдатках—51.723.698 р. 49 к.

Прэзыдыум ЦВК канстатаваў, што пры выкананьні бюджэту былі ў асноўным выкананы дырэктывы ўраду СССР і БССР: аб рацыяналізацыі дзяржаўнага апарату, аб скарачэньні адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў па бюджэту, аб правядзеньні дзяржаўнага нармаваньня зарплаты і аб зьмяншэньні субсыдыраваньня ведамстваў за рахунак звышкаштарысных асыгнаваньняў.

У фінансава-гаспадарчай дзейнасьці наглядалася некаторае палепшаньне, але разам з гэтым пры выкананьні выдатковай часткі бюджэту быў выяўлен шэраг недахопаў. Даходная частка бюджэту выканана са значнай напружанасьцю.

Прэзыдыум ЦВК немеціў шэраг мерапрыёмстваў, якія павінны быць ажыцьцёўлены пры складаньні бюджэту будучага году.

Адзначаючы вялікую і ўсё ўзрастаючую ролю Дзяржаўнага Фінансавага Кантролю з ростам дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў і асыгнаваньняў на народную гаспадарку, Прэзыдыум ЦВК пастанавіў прыняць крокі да ўзмацненьня фінансавага кантролю і прапанаваў усім установам стварыць спрыяючыя ўмовы для працы апошняга.

У Савнаркоме БССР.

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні:

АБ БЯСПЛАТНЫМ І ЛЬГОТНЫМ ВОДПУСКУ ДРАЎІНЫ ГЭРОЯМ РСЧА І БЫЛЫМ ЧЫРВОНЫМ ПАРТЫЗАНАМ.

З мэтаю далейшага ўзмацненьня гаспадаркі гэрояў Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі і былых чырвоных партызанаў, Савет Народных Камісараў запрапанаваў НК Земляробства з 1-га кастрычніка 1928 г. забясьпечыць бядняйшую частку былых чырвоных партызанаў і гэрояў Чырвонай арміі бясплатным водпускам лясных матар'ялаў і апалу. Пры ўстанаўленьні фонду бясплатных і льготных водпускаў драўніны за 1928-29 г. павінна быць выдзелена частка фонду для задавальненьня патрэб былых чырвоных партызанаў і гэрояў Чырвонай арміі.

СНК пастанавіў таксама спыніць усе справы аб самавольных парубках, зробленых да выданьня гэтай пастановы бяднейшаю часткаю былых чырвоных партызанаў і гэрояў Чырвонай арміі, калі гэтыя парубкі ня былі паўторныя і ня мелі характару масавых руйнуючых парубак, зьяўлі арышт наложаны на самавольна высечаны лес, калі гэты лес знаходзіўся пры сядзібе парубшчыкаў—былых чырвоных партызанаў і гэрояў Чырвонай арміі, і калі таксавая каштоўнасьць яго не перавышае 25 руб. і парубка была зроблена да моманту выданьня гэтай пастановы. Усякія спагнаньні па парушэньнях пабочных карыстаньняў зробленых да выданьня гэтай пастановы, калі яны ня мелі характару самавольнага шкоднага зьнішчэньня маладнякоў ці іншай буйнай шкоды—адмяняюцца. Усякія справы, якія ўзьніклі за парушэньне абежніка НК Земляробства за 16-У—25 г. спыняюцца.

Выключаныя за самапраўныя парубкі былыя чырвоныя партызаны і гэроі Чырвонай арміі з складу карыстальнікаў лясамі мясцовага значэньня павінны быць залічаны зноў у склад аб'яднаньня лесакарыстальнікаў.

АБ УЗАЕМААДНОСІНАХ ОРГАНАЎ УЛАДЫ З КААПЭРАЦЫЯЙ.

СНК прыняў распрацаваны камісіяй законад. праэктаў пры СНК праэкт пастановы аб узаемаадносінах рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады з каапэрацыяй і аб адказнасьці гэтых органаў за страты каапэрацыі ад іх незаконных загадаў каапэрацыйным арганізацыям. Гэтаю пастановаю ўсім ведамствам і мясцовым органам улады забараняецца загадваць каапэрацыйным арганізацыям, рабіць непрадугледжаныя законамі выдаткі, даваць ім заданьні, непрадугледжаныя плянамі іх дзейнасьці, загадваць каапэрацыйным арганізацыям, уваходзіць членамі ў іншыя арганізацыі і ўкладваць у гэтыя арганізацыі сродкі. Забараняецца органам улады ўсялякае ўмешваньне ў работу каапэрацыйных арганізацый, калі гэтыя органы не ўпаўнаважаны на гэта. За парушэньне гэтай пастановы службовыя асобы адказваюць у крымінальным парадку.

За страты каапэрацыйных арганізацый ад парушаючых гэтую пастанову няправільных дзеяньняў службовых асоб, калі няправільнасьць дзеяньня будзе ўстаноўлена судом, орган улады адказвае паводле 449 арт. Гр. Кодэксу.

Гэтая пастанова ўносіцца па зацьверджаньне прэзыд. ЦВК.

АБ МЕРАПРЫЁМСТВАХ ПА ЖЫЛІШЧНАЙ ГАСПАДАРЦЫ.

СНК прыняў распрацаваны камісіяй законад. праэктаў пры СНК праэкт пастановы аб мерапрыёмствах па жылішчнай гаспадарцы. Паводле гэтай пастановы жылыя дамы, якія ўваходзяць у муніцыпалізаваны фонд, эксплёатуюцца мясцовымі саветамі, а тыя, што знаходзяцца пад ведамам прадпрыёмстваў прамысловасьці і транспарту—гэтымі прадпрыёмствамі або непасрэдна, або [illegible] арэндным каапэрацыйным т-вам, дзяржаўным установам, прафсаюзным і іншым грамадзкім арганізацыям і індывідуальным арэндатарам.

У дагаворах арэнды павінна быць запісана, што 10 проц. жылой плошчы, якая аддаецца ў арэнду, мясцовыя саветы або прадпрыёмствы скарыстоўваюць для засяленьня рабочымі і служачымі па свайму погляду; у дамох, якія ўжо здадзены ў арэнду, 10 пр. жылой плошчы пераходзіць у распараджэньне мясцовых саветаў або прадпрыёмстваў прамысловасьці і транспарту па меры апаражненьня гэтай плошчы ад жыльцоў. Кватэры і пакоі, якія апаражняюцца ў дамах жылішчна-арэндных каапэрацыйных таварыстваў, апроч памянёных 10 проц., пасьля таго, як члены таварыстваў задаволены жылой плошчаю—гэтыя кватэры і пакоі аддаюцца іншым рабочым і служачым прамысловасьці і транспарту.

Мясцовыя саветы павінны ўтварыць з часткі муніцыпалізаваных і пабудаваных імі дамоў маноўраны фонд. Гэты фонд і дамы, што знаходзяцца пад ведамам прадпрыёмстваў, засяляюцца па дагаворах на пэўны тэрмін, пасьля якога саветы і прадпрыёмствы маюць права высяліць жыльца ў адміністрацыйным парадку.

Забараняецца здаваць у арэнду памяшканьні, якія апаражняюцца ў муніцыпалізаваных дамох, асобам непрацоўных катэгорый. Каб палегчыць абмен жылішчамі, гарадзкія саветы могуць арганізоўваць агульна-гарадзкія і райённыя пасрэдніцкія кватэрныя бюро. Жылішчна-арэндныя каапэрацыйныя таварыствы павінны прымаць у лік сваіх членаў жадаючых рабочых і служачых, калі яны зьяўляюцца новымі жыльцамі, якім домакіраўніцтва здало жылую плошчу, жыльцамі, што засяліліся праз абмен жылой плошчы, сталымі жыльцамі нячленамі таварыства або часовымі жыльцамі, якія жывуць у доме ня менш за 1 год. Будынкі могуць здавацца ў арэнду жылішчным таварыствам на тэрмін да 12 гадоў. Далей у пастанове гаворыцца аб парадку крэдытаваньня жылішчна-арэндных каапэрацыйных і жылішчна-будаўнічых таварыстваў.

АБ ІНСТЫТУЦЕ ФІЗЫЧНЫХ МЭТАДАЎ ЛЯЧЭНЬНЯ.

СНК прызнаў мэтазгодным пабудаваць у Менску з бягучага будаўнічага сэзону будынак для Інстытуту Фізычных Мэтадаў лячэньня каштоўнасьцю (без абсталяваньня) у 206 тыс. руб. Пабудова Інстытуту павінна быць скончана ў 2 будаўнічых сэзоны—28 і 29 г. г., з тым каб эксплёатацыя Інстытуту пачалася з 1-га лістапада 1929 году.

АБ ЗАМЕЖНАЙ КАМАНДЫРОЎЦЫ НАРОДНАГА КАМІСАРА ГАНДЛЮ т. АДАМАЙЦІСА.

СНК дазволіў Народнаму Камісару Гандлю т. Адамайцісу паўтарамесячную замежную камандыроўку з 1-га чэрвеня г. г.

ПАДАРОЖЖА ЧЛЕНУ УРАДУ ПА МАЗЫРШЧЫНЕ.*)

(Уражаньні і наглядання).

Жыткавічы.

Жыткавічы—апошняя прыгранічная станцыя. Некалькі вёрст далей—і перад намі рака Случ, па якой праходзіць мяжа. Мост. На нашым баку—арка з надпісам «рабочым Захаду—вітань». Гэткі-ж надпіс—простае, але ўзбуджаючае братэрскае прывітаньне,—на польскай мове, з другога боку аркі, з польскага боку. Палова мосту—наша, другая палова—польская. Варта з абодвых бакоў мосту. Забыты мундзір польскага легіянэра выразна відаць на мосьце. Мы ўваходзім на мост. З намі начальнік пагранатраду. Ён абменьваецца з легіянэрам звычайным прывітаньнем...

Зусім ціха на рацэ і ў лесе. Які спакойны з надворнага боку малюнак, але колькі суровай таямнічасьці крыецца за гэтым! Наш прыгранічнік жыве ў бязупынным напружаньні сярод небясьпек, якія пагражаюць яму з другога берагу, то ў выглядзе шпіёнскай кантрабанды, а часамі і ў выглядзе кулі. Але прыгранічнік прызвычаен і выконвае свае абавязкі: абыходзіць варту, удасканальваецца ў стральбе, вядзе працу сярод вяколічнага насельніцтва, дапамагаючы яму ня толькі словам, але ўсім, чым можа,—і вучыцца... Матар'яльныя ўмовы жыцьця прыгранічніка досыць здавальняючыя: жыве ён чыста, прасторна, ёсьць добрая лазьня, паступова адбудоўваецца. Зразумела, часамі не хапае ў гэтай глушы сякіх-такіх культурных забаў, цяжка ўвесь час знаходзіцца ў напружаным становішчы. Але пагранічнік цьвёрда і адважна стаіць на сваёй варце.

Белае Возера.

З Жыткавіч мы коньмі едзем у Белае Возера. Недалёка ад яго знаходзіцца рыбная гаспадарка Наркамзему, адзіная прамысловага характару гаспадарка ў Саюзе. Шэраг простакутнікаў—саджалак. У іх разводзяцца карпы. Па адпаведнай сыстэме канаў у гэтыя саджалкі ўвесь час цячэ вада. Спэцыяльныя краты затрымліваюць пры гэтым усякіх дранежнікаў, шчупакоў, вокуняў і інш. У працягу 12 месяцаў з ікрынак вырастаюць буйныя карпы, рачныя сьвінкі, як іх завуць, кожны важыць кілё. Гэта ўжо таварная рыба, якая экспартуецца заграніцу. Экспорт гэтай рыбы вельмі рэнтабельны, бадай гэта адзін з найбольш рэнтабельных відаў нашага экспорту. У той-жа час зварот капіталу ў гэткім прадпрыёмстве вельмі хуткі. Такім чынам, рыбная гаспадарка зьяўляецца адной з найбольш выгадных. Сёлета пад штучныя саджалкі занята ўжо звыш 800 гэкт. Наркамзем думае давесьці сёлета гэтую плошчу да 1000 гэкт.

Гэта сапраўды важная справа шпарка разгортваецца і ўжо ў бліжэйшую будучыню, бясспрэчна, будзе вялізарным прадпрыёмствам.

Тав. Галадзед выяўляе вялікую зацікаўленасьць і распытвае аб усякіх падрабязнасьцях. Загадчык гаспадаркі, т. Рамез, ахвотна і відаць з любоўю да сваёй справы адказвае на ўсе запытаньні.

Штучнае разьвядзеньне рыбы мае вялікія магчымасьці ў Палесьсі (ды яшчэ ў Полаччыне)—прыродныя ўмовы гэтаму вельмі спрыяюць. Разьвіцьцё справы—задача ня толькі дзяржаўных органаў, у гэтым выпадку Наркамзему, але і грамадзкіх арганізацый, як-та сельска-гаспадарчай каапэрацыі, камітэтаў узаемадапамогі і г. д. Вопыт арганізацыі сялянскіх рыбных арцеляў даў добрыя вынікі. Адна такая арцель з 15 сям'ю, што арганізавалася пядаўна ў Мазыршчыне, атрымала ўжо ў першы год прыбытак па 50 рублёў на сям'ю. Трэба дадаць, што гэта справа не вымагае асабліва буйных сродкаў, а ўкладзеныя сродкі хутка акупаюцца. На жаль, наша каапэрацыя гэтай справе яшчэ не надае належнай увагі, ня гледзячы на тое, што яна мае буйнае значэньне для ўсёй народнай гаспадаркі Беларусі і чават Саюзу.

Аг

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену арт. 27 «Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадаркі ў іх».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць вынесьці арт. 27 «Палажэньня аб лясох мясцовага значэньня і аб вядзеньні гаспадаркі ў іх» (З. З. БССР 1926 г. № 8, арт. 37), запісаўшы яго ў наступнай рэдакцыі:

«Канфіскаваны пры лесапарушэньнях у лясох мясцовага значэньня лес, а таксама каранявая каштоўнасьць перадаюцца ў даход дзяржаўнага бюджэту, а штрафныя сумы, накладзеныя ў адміністрацыйным парадку за лесапарушэньні, ідуць у даход мясцовага бюджэту».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР. **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

17 мая, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об изменении ст. 27 „Положения о лесах местного значения и о ведении хозяйства в них".

Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляют изменить ст. 27 «Положения о лесах местного значения и о ведении хозяйства в них» (С. З. БССР 1926 г., № 8, ст. 37), изложив в следующей ее редакции:

„Конфискованный при лесонарушениях в лесах местного значения лес, а также корневая стоимость передаются в доход государственного бюджета, а штрафные суммы, наложенные в административном порядке за лесонарушения, поступают в доход местного бюджета".

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР **Н. Голодед.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

17 мая, 1928 г.
г. Минск.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену п. „д" арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР „аб адлічэньні па мясцовых бюджэтах у спэцыяльныя сродкі на жылішчнае будаўніцтва».

На падставе арт. 15 пастановы ЦВК і СНК Саюзу ССР за 4 студзеня 1928 г. «Пра кватэрную палітыку» (З. З. ССР 1928 г., №6, арт. 49) Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць: п. «д» арт. 3 гэтае пастановы за 14 мая 1927 г. «Аб адлічэньні па мясцовых бюджэтах у спэцыяльныя сродкі на жылішчнае будаўніцтва (З. З. БССР 1927 г. № 24, арт. 114) запісаць у наступнай рэдакцыі:

«д) адлічэньняў ад арэндной платы за зямлёвыя, гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканьні ў разьмеры, які ўстанаўляецца адпаведнымі акруговымі выканаўчымі камітэтамі, але ня менш 50 процантаў арэндной платы».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

17 мая 1928 г.
г. Менск.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак вырашэньня спрэчак аб лесапарушэньнях паміж лясным ведамствам і дзяржаўнымі лесазагатоўшчыкамі.

Для спрашчэньня парадку вырашэньня спрэчак аб лесапарушэньнях паміж лясным ведамствам і дзяржаўнымі лесазагатоўшчыкамі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць.

1. Спрэчкі аб лесапарушэньнях на суму да 500 рублёў, якія ўзьнікаюць паміж Лясным Аддзелам Народнага Камісарыяту Земляробства БССР і яго органамі на месцах, з аднаго боку, і дзяржаўнымі лесазагатоўшчыкамі—з другога—вырашаюцца на месцах арбітрам, які называецца Прэзыдыумам акруговага выканаўчага камітэту.

2. Для высьвятленьня спрэчкі арбітр выклікае прадстаўнікоў абедзьвюх зацікаўленых старон.

Пастанова Арбітру зьяўляецца канчатковай і ня можа быць абскаржана.

3. Сума якая будзе прысуджана арбітрам в лесазагатоўшчыкаў, спагнаецца ў тэрмін такім-жа парадку, як і плата ад пня.

4. Спрэчкі аб лесапарушэньнях на суму звыш 500 рублёў вырашаюцца Арбітражнай Камісіяй пры Эканамічнай Нарадзе ў агульным парадку.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

24 мая 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

о порядке разрешения споров о лесонарушениях между лесным ведомством и государственными лесозаготовителями.

В целях упрощения порядка разрешения споров о лесонарушениях между лесным ведомством и государственными лесозаготовителями Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР **постановляют:**

1. Споры о лесонарушениях на сумму до 500 рублей, возникающие между лесным отделом Народного Комиссариата Земледелия БССР и его органами на местах, с одной стороны, и государственными лесозаготовителями—с другой—разрешаются на местах арбитром, назначаемым президиумом окружного исполнительного комитета.

2. Для выяснения сущности спора арбитр вызывает представителей обеих заинтересованных сторон.

Постановление арбитра является окончательным и обжалованию не подлежит.

3. Присужденная арбитром сумма с лесозаготовителей взыскивается в таком же порядке, как и пененная плата.

4. Споры о лесонарушениях на сумму свыш 500 рублей разрешаются Арбитражной Комиссией при Экономическом Совещании в общем порядке.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР **М. Карклін.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

24 мая 1928 года.
г. Минск.

ПОСТАНОВА

Савету Народных Камісараў БССР

пра зачыненьне прадпрыймстваў для азартных гульняў.

На падставе пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР за 8 мая 1928 г. «Пра зачыненьне прадпрыймстваў для гульняў» (Изв. ЦИК СССР и ВЦИК РСФСР 1928 г., № 115) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Забараніць адчыненьне прадпрыймстваў для гульні ў карты, рулетку, лото і для іншых азартных гульняў.

2. Запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам зачыніць усе памянёныя ў артыкуле 1 гэтае пастановы прадпрыймствы, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **Н. Угараў.**

24 мая, 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров БССР

о закрытии заведений для азартных игр.

На основании постановления Совета Народных Комиссаров Союза ССР от 8 мая 1928 г. „О закрытии игорных заведений" (Изв. ЦИК СССР и ВЦИК РСФСР 1928 г. № 115) Совет Народных Комиссаров постановляет:

1. Запретить открытие заведений для игры в карты, рулетку, лото и других азартных игр.

2. Предложить окружным исполнительным комитетам закрыть все упомянутые в статье 1 настоящего постановления заведения, находящиеся на их территории.

Зам. Председателя Совета Народных Комиссаров БССР **М. Карклін.**

За Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **Н. Угаров.**

24 мая, 1928 г.
г. Менск.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да 25-цігодзьдзя 2-га зьезду партыі.

Гіспарт ЦК КП(б) Б і Музэй Рэвалюцыі распачалі падрыхтоўку да 25-цігодзьдзя 2-га зьезду партыі.

У працягу кампаніі мяркуецца правесьці шэраг дакладаў на партыйных і рабочых сходах для ўсебаковага высьвятленьня эпохі 1900—1904 г. г.

Таксама маркуецца наладзіць вечары-ўспаміны падпольных працаўнікоў-бальшавікоў.

У музэі Рэвалюцыі да гэтага часу будзе папоўнен гістарычнымі матар'ялямі і дакумантамі аддзел, які характарызуе эпоху 1900—1904 г. г.

Падрыхтоўваецца да друку брашура Шапавалава і Майзэля, прысьвечаная рэвалюцыйнаму руху эпохі 1900—1904 г. г.

Кантрактацыя пасеваў у Меншчыне.

Кантрактацыя пасеваў у Меншчыне праходзіла і праходзіць слаба і пагражае невыкананьнем зацьверджанага пляну.

Растлумачальная праца амаль не вялася. Сельска-гаспадарчыя т-вы дрэнна вывучылі практыку кантрактацыі, з прычыны чаго былі скрыўленьні агульнага напрамку кантрактацыі.

Райвыканкомы слаба правяралі працу пізавой сеткі.

Упаўнаважанаму акруговай РСІ запрапанована праверыць прычыны слабага ходу кантрактацыі і вінаватых прыцягнуць да адказнасьці.

Забесьпячэньне Менску малаком.

Менскі Акргандаль запрапанаваў Белсельсаюзу давесьці штодзённую дастаўку ў Менск малака да 8000 літраў, а Менсельпрому і малочнаму таварыству—да 2000 літраў кожнаму. Разам з тым запрапанавана прыняць меры да своечасовай дастаўкі малака ў крамы. Менскаму ЦРК запрапанавана адчыніць свае крамы для продажу малака—некаторыя не пазьней 7 гадзін раніцы, а рэшту—не пазьней 7 з палов. і 8 з палов. гадз. раніцы.

Прывітаньне ўраду.

На імя ўраду БССР паступіла прывітальная тэлеграма ад 1-й Бабруйскай акруговай канфэрэнцыі «Озэту».

Загатоўка яек.

За першую дэкаду мая па БССР было загатоўлена 337 скрынак экспартных яек, а за другую—загатоўлена 1675 скрынак. З агульнай колькасьці загатовілі: Белдзяржгандаль — 1657 скрынак, сельска-гаспадарчая кааперацыя—127 скрынак; рэшту загатовіла спажывецкая кааперацыя.

Геолёгічная праца.

Па заданьні Усесаюзнага геолёгічнага камітэту ў БССР прыехала ленінградская геолёгічная экспэдыцыя на чале з вядомым геолёгам Жырмунскім, які ўжо мае скарутна працы па гідра геолёгіі на тэрыторыі сучаснай Савецкай Беларусі.

750 новых настаўнікаў.

7-га чэрвеня заканчваецца выпуск новых настаўнікаў з пэдтэхнікумаў. Усяго сёлета мае быць выпушчана каля 350 новых настаўнікаў.

У гэтым ліку Менскі белпэдтэхнікум мае выпусьціць 39 настаўнікаў, Полацкі—26, Рагачэўскі—33, Палескі пэдтэхнікум—16 настаўнікаў і г. д.

Сёлета таксама адбудзецца выпуск 2-хгадовых пэдагагічных курсаў, якія дадуць звыш 400 новых настаўнікаў.

105000 руб. на электрафікацыю.

Прэзыдыум Менскага АВК зрабіў дагавор з камунальным банкам аб водпуску апошнім 105000 руб. у выглядзе доўгатэрміновай пазыкі на электрафікацыю акругі.

Саматужная прамысловасьць у Менскай акрузе.

На 1 кастрычніка 1927 году Беларускі Саматужна-Прамысловы Саюз налічваў у Менскай акр. 53 вытворчыя арцелі з 755 членамі і 15 крэдытна-прамысловых т-ваў з 3955 членамі. На 1 красавіка 1928 году колькасьць арцеляў павялічылася да 104 з 1656 членамі, а колькасьць крэдытна-прамысловых т-ваў да 16 з 4534 членамі.

Зваротныя сродкі аднэй арцелі, у параўнаньні з леташнім годам, павялічыліся на 43 проц. Уласныя сродкі —на 9 проц.

Крэдытна-прамысловыя таварыствы маюць мала зваротных сродкаў, з прычыны чаго саматужнікам выдаюцца малыя крэдыты.

Ня ў поўнай меры разгарнулася смалакурная і керамічная прамысловасьць.

Перадача дзяржаўнай зямельнай маемасьці ў працоўнае карыстаньне.

Праца па перадачы зямель з дзяржаўных зямельных фондаў і маёмасьці ў працоўнае карыстаньне па Менскай акрузе ўжо скончана.

У далейшым АКРЗА і Райвыканкомы павінны перадаць у працоўнае карыстаньне ў працягу сёлетняга году лішнія зямельныя фонды, якія да гэтага часу ня былі перададзены. Апроч таго, павінны быць перададзены лішнія лугавыя фонды, садова-гароднія гаспадаркі і міжлесныя сенажаці.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК.

(НА 31 МАЯ 1928 г.).

Абл. 1 дзярж. паз.—прад. 4—70,5, куп. 4—68,5

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—06,5, куп. 5—03,5.

Абл. 2 сял. паз.—куп. 5.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—07, куп. 5—05.

Абл. 10 пр. паз. 27 г.—прад. 25—45, куп. 25—35.

Абл. дзярж паз. 1926 г.—прад. 121—50, куп. 119—50.

Абл. 12 проц. дзярж. паз.—прад. 106—02, куп. 105—97.

Абл. 6-проц. паз. індустр.—прад. 24—43,5, куп. 24—38,5.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ЛЕТНЯГА СЬВЯТА ФІЗКУЛЬТУРЫ.

Парадак спартакіяды.

7 чэрвеня распачынаецца розыгрыш менскага акруговага першэнства па футболу, баскетболу і гандлёх. Розыгрыш павінен скончыцца 23 чэрвеня.

Удзельнічае 15 футбольных, 39 баскетбольных і 12 гандлёвых камандаў.

5 ліпеня афіцыйны пачатак спартакіяды Менскай акругі. У праграму спаборніцтваў уваходзіць лёгкая атлетыка (бег на 100, 200, 400 і 800 мэтраў; пяцібор'е для мужчын і трыбор'е для жанчын), плаваньне (100, 300 і 1500 мэтраў і скачкі ў ваду ў чырвонаармейскай вопратцы) і вэлёсыпэдзе (кросс 30 кілёмэтр.).

Масква—Менск—Прага на вэлёсыпэдзе.

3-га чэрвеня прыбудзе ў Менск сябры чэхаславацкай федэрацыі пралетарскай фізкультуры тав. Гула, які ўжо выехаў з Масквы на вэлёсыпэдзе.

Менскі Акруговы Савет ФК арганізуе тав. Гула ўрачыстае спатканьне і провады яго да граніцы.

Футбольныя і баскетбольныя спатканьні.

Да розыгрышу афіцыйных матчаў спартакіяды на баскетболу і футболу 2, 3, 4 і 5 чэрвеня на пляцоўцы „Прафінтэрна" адбудуцца сяброўскія спатканьні. Першы футбольны матч—паміж камандамі саюзу будаўнікоў і мэталістаў.

Двохтыдневік фізкультуры ў Менску.

Да пачатку акруговай спартакіяды ад 15 чэрвеня да 1-га ліпеня МАСФК і АЛКСМ будзе праведзены ў Менску двухтыдневік фізкультуры.

Мэтаю двухтыдневіка зьяўляецца:

папулярызацыя акруговай спартакіяды і ўнутранае рацыянальнае мэтадзі і сяброў КСМ у фізкультурныя гурткі і добраахвотнае ахоп КСМ да кіраўніцтва гурткамі фізкультуры; згуртаваньне грамадзкай думкі навакол фізкультурных мерапрыемстваў (набудова цэнтральнага стадыёну, дому фізкультуры і барацьба з п'янствам і г. д.

Тэхнічнае спаборніцтва.

Як падрыхтоўку да летніх спаборніцтваў, зараз МАСФК праводзіць на пляцоўках „Прафінтэрна" вясеньняе тэхнічнае спаборніцтва. Прымае ўдзел каля 20 чалавек.

СУД.

ЖЫЦЬЦЁ НЕ ПА СРОДКАХ.

З таго часу, як Алесь Мікалаеў Грэбенчыкаў заняў пасаду загадчыка гаспадарчай і транспартнай часьці Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, характар яго моцна зьмяніўся.

Грэбенчыкаў стаў проста «душа», а не чалавек. Кватэруючы ў грамада. Язьвінскай, Грэбенчыкаў ніколі з ёй за кватэру не разьлічаўся па ўмове, а, атрымаўшы пэнсію, сыпае бывала з кішэні на стол кучу срэбра, а калі Язьвінская яму ўсьміхнецца, дык ён крые срэбра 2-3 чырвонцамі і скажа:

— Бя, мне, мадам Язьвінская, і ведайце, што я хоць і сын мужыка, а гонар мае панскі.

Так Грэбенчыкаў сыпаў грашмі, вазіў Язьвінскую ў цырк, тэатр і г. д.

Ажаніўшыся, Грэбенчыкаў зажыў яшчэ весялей: амаль кожны вечар зьбіраў гасьцей на вечарыны, дзе разкой ліліся самыя дарагія віны і каньяк.

Нават сабутыльнікі Грэбенчыкава дзівіліся, адкуль ён браў на гульню грошы.

Нагула, Грэбенчыкаву жылося добра і весела. У лістох да бацькі ён толькі скардзіўся на тое, што менскія яўрэі яму вельмі не спадабаліся і што ён мае намер у хуткім часе важыць у больш прыгожым горадзе.

Аднак, думка Грэбенчыкава ня спраўдзілася: жыцьцё не па сродках у выніку даве растрату дзяржаўных сродкаў у суме 3338 р. 51 к., і Грэбенчыкаў папаў пад суд, які прыгаварыў яго на тры гады і 6 месяцаў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і са спагнаньнем з яго ў карысьць Белдзяржвыдавецтва 3338 р. 51 к.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Пахуліганіў.

Грамадз. г. Менску Пётра Жук 3 студзеня г. г., будучы пад добрай «мухай», вайшоў да сваёй знаёмай Ліды Мальдзавай, дзе падпіў гваз і павыбіваў вокны. Суд прыгаварыў Пётра Жука на адзін год зьняволеньня са спагнаньнем з яго ў карысьць Мальдзавай 9 р. 50 к. за разьбітыя вокны.

Бухгальтар-растратчык.

Грамадзянін г. Менску Вульф Ляхоўскі, будучы бухгальтарам саюзу металістаў растраціў 996 руб. 40 кап., якія паступілі на выпіску журнала „Мэталіст". Суд прыгаварыў Вульфа Ляхоўскага на год зьняволеньня са спагнаньнем з яго на карысьць саюзу 996 руб. 40 кап. Па аснове амністыі ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычніка вар рэвалюцыі ад трыманьня пад вартай Ляхоўскі вызвалены.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кнігі:

1. „Асьвета № 3, 1928 г. Часопіс Народнага Камісарыяту Асьветы і Саюзу працаўнікоў Асьветы, стар. 141, цана 80 кап. Выданьне Народнага Камісарыяту Асьветы БССР.

2. „Збор твораў" Я. Купала, том 4. Стар. 226, цана 2 руб.

3. «Чырвоная Зьмена" М. Калінічэнка і І. Мазур. Кніжка для другога году навучаньня па комплексным системе, значэньне постае старэстыкавае. Рэкамендавана Навукова-Мэтодычным Кс. этам Нар. Кам. Асьветы БССР.

4. „Шлях студэнтства" № 6-7. стар. 48, цана 25 кап. Орган Выканграфбюро прэзідыюм Бел. Дзярж. Унівэрсытэту.

АПАВЯШЧЭНЬНІ.

ЛЕТНІ САД ПРАЦАЎНІКОЎ АСЬВЕТЫ.

У пятніцу, 1-га чэрвеня—кіно. «Чалавек з растарана».

Пачатак а 10 гадзіне.

1-га чэрвеня а 10 гадзіне раніцы ў садзе адчыненьне дзіцячых пляцовак.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА**

СХОД ЭСКАДРОНУ ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ.

У суботу, 2-га чэрвеня, а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні рэдакцыі газеты «Чырвоная Зьмена» адбудзецца першы арганізацыйны сход атраду лёгкай кавалерыі.

На сход запрашаюцца таксама комсамольцы, якія працуюць у сэкцыях РСІ і пры Менскай АКК КП(б)Б.

Запісь у атрад працягваецца да 2-га чэрвеня. Запісвацца можна штодзённа ў рэдакцыі «Чырвонай Зьмены».

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА».

ТЭАТР-КІНО

БУДЫНАК БЕЛ ДЗЯРЖ. ТЭАТРУ.

ГАСТРОЛІ ансамбля артыстаў ДЗЯРЖ. АКАД. МАСКОЎСКАГА МАЛАГА ТЭАТРУ пры ўдзеле заслуж. арт. В. Н. Пашэннай, В. О. Массалітінавай, Н. К. Якаўлева, Н. Ф. Кастрамскога, В. Р. Альхоўскага.

Чацьвер, 31 мая

„ИДИОТ"

Адкрыт папярэдні продаж білетаў у касе тэатру штодня ад 12—2 г. і ад 5—9 г. веч. У рабоч. касе—з 11 з пал. да 2 г. і ад 4—6 г. Пачатак у 8½ веч.

Упаўнаваж. Р. В. Ольменіцкі.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».

З аўторка, 29 мая—грандыёзнае адчыненьне тэатру

„МЮЗІК-ХОЛЛ".

У праграме—лепшыя расейскія і замежныя атракцыёны. Падрабязнасьці ў афішах.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".

З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні—29, 30 і 31 мая грандыёзны прыключэнскі фільм

„НАЧНЫ ЭКСПРЭС" з удзел. Гары Піль

УВАГА! Чарговая пастаноўка—„ДАЧКА ДВУХ БАЦЬКОЎ".

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».

„СТЭНЛЕЙ У НЕТРАХ АФРЫКІ".

2 серыі за адзін сэанс. На 1-шы сэанс—усе білеты па 25 кап. Пачатак роўна ў 6 гадз. 30 хв.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».

Толькі 3 дні—29, 30 і 31 мая два фільмы за адзін сэанс:

1. „КНЯЖНА МЭРЫ"—у 8-х частках.

2. „БЭЛА"—у 7-х частках.

НА ЧЭРВЕНЬ СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА НА ЧЭРВЕНЬ

на самую папулярную распаўсюджаную беларускую ГАЗЭТУ

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Орган Ц. В. К. Б. С. С. Р.

ЧАТЫРЫ РАЗЫ Ў МЕСЯЦ РАЗАМ З ГАЗЭТАЙ ПАДПІСЧЫКАМ РАССЫЛАЮЦЦА БЯСПЛАТНА ДАДАТКІ.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.	На 3 м-цы	2 р. 70 к.
„ 2 м-цы	1 р. 80 к.	„ 6 м-цаў	4 р. — к.
На год	8 р. — к.		

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: у Менску—у канторы газэты рог вуліц Ленінскай і К. Маркса; у правінцыі—упаўнаважанымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

Галоўлітбел 302.

Да ведама падпісчыкаў „САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ".

Пры неатрыманьні своечасова газэты, трэба даведацца ў сваім паштовым аддзяленьні, ці ёсьць там КАРТКА на імя падпісчыка. Калі ёсьць, патрабаваць газэту там. Калі няма, зрабіць запытаньне ў кантору, паведаміўшы, куды здадзена падпіска, на які тэрмін, нумар квітка і свой дакладны адрас.

Бяз гэтых вестак скаргі разглядацца ня будуць.

АБВЯШЧЭНЬНЕ.

У сучасны момант у касах фінорганаў БССР маюцца запасы ніжэйпералічаных купюр вэксальных блянкаў, якія прадаюцца ўсяму насельніцтву па яго патрабаваньні.

1. У	—	руб.	25	кап.	на	валюту	вэксаля	да	100 руб.
2. »	—	»	50	»	»	»	»	»	200 »
3. »	—	»	75	»	»	»	»	»	300 »
4. »	1	»	—	»	»	»	»	»	400 »
5. »	1	»	25	»	»	»	»	»	500 »
6. »	1	»	50	»	»	»	»	»	600 »
7. »	1	»	75	»	»	»	»	»	700 »
8. »	2	»	»	»	»	»	»	»	800 »
9. »	2	»	25	»	»	»	»	»	900 »
10. »	2	»	50	»	»	»	»	»	1.000 »
11. »	3	»	—	»	»	»	»	»	1.200 »
12. »	3	»	75	»	»	»	»	»	1.500 »
13. »	5	»	—	»	»	»	»	»	2.000 »
14. »	6	»	25	»	»	»	»	»	2.500 »
15. »	7	»	50	»	»	»	»	»	3.000 »
16. »	10	»	—	»	»	»	»	»	4.000 »
17. »	12	»	50	»	»	»	»	»	5.000 »
18. »	15	»	»	»	»	»	»	»	6.000 »
19. »	17	»	50	»	»	»	»	»	7.000 »
20. »	20	»	—	»	»	»	»	»	8.000 »
21. »	22	»	50	»	»	»	»	»	9.000 »
22. »	25	»	—	»	»	»	»	»	10.000 »
23. »	37	»	50	»	»	»	»	»	15.000 »
24. »	50	»	—	»	»	»	»	»	20.000 »
25. »	62	»	50	»	»	»	»	»	25.000 »
26. »	75	»	—	»	»	»	»	»	30.000 »
27. »	100	»	—	»	»	»	»	»	40.000 »
28. »	125	»	—	»	»	»	»	»	50.000 »
29. »	187	»	50	»	»	»	»	»	75.000 »
30. »	250	»	—	»	»	»	»	»	100.000 »

Вэксаль, для валюты якога устаноўлен суадпаведны разбор блянку, трэба пісаць абавязкова на блянках іменна гэтага разбору, за выключэньнем разбораў блянкаў у 3 р., 6 р. 25 к., 100 р. і 187 р. 50 к., абавязковае напісаньне вэксалёў на якіх устанаўляецца з 15-га чэрвеня 1928 году. Парадак напісаньня вэксалёў абвешчаны, ў газ. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» 15 лютага 1928 г., застаецца ў моцы.

Нам. Наркамфіна ССР **БУНІН.**

Нам. Н-ка Падатковага Кіраўніцтва **РЭКСЬЦІН.**

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

БАБРУЙСКАГА АКРУГОВАГА ТАВАРЫСТВА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА КРЭДЫТУ

АКТЫЎ **НА 1-га КАСТРЫЧНІКА 1927 г.** *ПАСЫЎ*

НАЗВА РАХУНКАЎ	Уступны баляс на 1-X-26 году.	Заключ. баляс на 1-X-1927 г.	НАЗВА РАХУНКАЎ	Уступны баляс на 1-X-26 году.	Заключ. баляс на 1-X-1927 г.
Каса і бягучыя рахункі	106288—94	62371—72	Асноўны капітал	52460—00	188555—00
Каштоўнасьці	145—00	110—00	Інш. уласн. капітал і фонды	223—12	47825—60
Дыскант і спэц. бяг. рах. пад вэксалі	158147—23	289882—35	Пазыкі	863584—15	2123393—58
Тавара-пазычк. аперацыі	1169—36	27667—35	Перанучот і перазаклад	—	85641—35
Мэтавыя пазыкі	744314—15	2209894—70	Уклады і бягучыя рахункі	94738—65	111962—29
Пратэрмінаваныя пазыкі	12193—00	500—00	Карэспандэнты	6736—68	66887—06
Карэспандэнты	1028—46	40605—09	Разьлікав. рахункі і інш. пастрабаван. сумы	5694—15	10638—48
Разьліковыя рахункі	59—69	1729—71	Розныя крэдыторы	207—14	4717—63
Розныя дэбіторы	2018—12	8156—05	Прыбыткі будучых гадоў	13716—77	28877—10
Маёмасьць і ўдзел у прадпрыемствах	953—39	45247—74	Нераразмеркаваны прыбытак бягучага году	—	30841—41
Выдаткі будучых гадоў	11043—32	13224—79			
БАЛЯНС	1037360—66	2699389—50	БАЛЯНС	1037360—66	2699389—50

РАХУНАК

прыбыткаў і страт за 1926-27 апэрацыйны год.

ДЭБЕТ *КРЭДЫТ*

НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА	НАЗВА РАХУНКАЎ	СУМА
Бягучыя выдаткі	19704—55	Процанты атрыманыя	99154—87
Процанты заплачаныя	58334—08	Камісія атрымаваная	3132—92
Камісія заплачаная	410—54	Прыбыткі Слуцкага аддзяленьня	7797—21
Амартызацыя маёмасьці	294—42		
Нявэўныя даўгі	500—00		
Прыбытак	30841—41		
Усяго	110085—00	Усяго	110085—00

Старшыня Праўленьня КІН. **Старшы бухгальтар КАЦНЭЛЬСОН.**

ЗГУБЛЕНЫ:

— Чырвонаарм. кніжка, выд. Чэрвенск. Паветраванкматам у 1920 г., 2) Конская карт., выд. Чэрвенск. вайсконым сталом на імя Ладуцько С., кв. 593.

— Асабовае пасьведчаньне Фуфты Е. Ю. выд. Высокагорскім с-савет. Бярэзінскага с-с., кв. 594.

— Каапэрац. кніжка Эфрон М. Б., выд. МЦРК, кв. 595.

— Сяброўская кніжка № 1397 Равікові Р. В., выд. саюзам Мэдсанпрацы, кв. 596.

— Сяброўскі білет Лукашэвіча У. М., выд. Менскім саюзам Працасьветы, кв 597.

— Сяброўская кніжка Даукша М. В., выд. Менакрадз. сап. забясьпекі, кв. 598.

— Сяброўская паявая кніжка № 1459 Лавіна А., выд. Чэрвенскім ЦРК у 1928 г., кв. 599.

— Часовая лекавая кніжка Гурэвіча Д., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 587.

— Заборная кніжка Яцушкоўскай С. С., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 587.

— Пашпарт Лабанава М. І., выд. Барысаўскай міліц., кв. 587.

1-я Дзяржаўная друкарня.